Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 11 (890) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 18 САКАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.

„БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-73"

25 лютага гэтага года ў памяшканні Галоўнага праўлення адбыўся фінальны агляд «Беларуская песня — 73».

Агляды «Беларуская песня» карыстаюцца вялікай папулярнасцю, а гэтыя словы паўтараю за аўтарам мінулагодняй справаздачы з цэнтральнага агляду. Аднак карыстаюся імі таму, што ў гэтым годзе зацікаўленне цэнтральным аглядам было настолькі вялікае, што не толькі зала і калідор былі заняты да апошняга месца, але 2/3 ахвотных гледачоў вымушана было адыйсці ад дзвярэй канцэртнай залы з прычыны недахопу месц. Не маем даных адносна колькасці гледачоў на павятовых аглядах, аднак факт, што ў павятовых аглядах ў 1970 годзе прыняло ўдзел усяго 32 асобы, у 1971 — 70 асоб, у 1972 г. — 125, а ў 1973 аж 158 аматараў-спевакоў, сведчыць сам за сябе.

Як і ў мінулым годзе, спраўна і ўмела вяла канцэрт Валя Філіпюк.

Ацэнкай паасобных спевакоў і калектываў, іх мастацкага ўзроўню і падборкі рэпертуару займалася журы пад старшынствам Веслава Дзюбінскага, доўгагадовага супрацоўніка БГКТ у галіне музыкі і спеву.

У цэнтральным аглядзе прыняло ўдзел 96 асоб: 16 салістаў і 22 вакальныя калектывы. Кожны з выступаючых абавязаны быў выканаць па дзве песні.

Першую ўзнагароду ў катэгорыі салістаў журы прызнала Аляксандру Бандаруку з Ляўкова, Гайнаўскага павету, дзве другія — Неаніле Харкевіч з Ласінкі, Гайнаўскага павету, і Аляксандру Раманюку з Дубяжына, Бельскага павету, а трэцюю — мінулагодняй лаўрэатцы другой узнагароды — Зофіі Цацэрка з Бабровнікаў. У групе дуэтаў першую ўзнагароду атрымаў дуэт з Орлі, Бельскага павету — Яўген Балло і Мікалай Лапух, а другую — дуэт Ніна Мушынская і Надзя Парэмбская з Гарадка, Беластоцкага павету. Надзвычай цікавымі аказаліся вакальныя калектывы. Першую ўзнагароду «выспяваў» квартэт з Плёскаў, Бельскага павету, дзве другія — жаночая група бельскага хору і мужчынская група з Дубяжына, Бельскага павету, а трэцяе — жаночы калектыў з Новай Волі, Беластоцкага павету.

Журы адзначыла таксама мастацкае майстэрства, арыгінальнасць выканання і падборку рэпертуару выканаўцаў фальклорнага калектыву з Арэшкава, Гайнаўскага павету, жаночага квартэта з Тапчыкал, Бельскага павету, і Анны Стахвіюк з Трасцянкі, Гайнаўскага павету.

Аматары-спевакі далі багаты і каляровы пяцігадзінны канцэрт. Характэрнай рысай сёлетняга агляду «Беларуская песня» была вялікая колькасць мужчынскіх калектываў. Высокі мастацкі ўзровень салістаў і калектываў гэта таксама адна з асноўных рысаў конкурсу.

Аднак найвялікшым багаццем была ўпершыню так шырока паказаная рэгіянальная фальклорная песня. Выступалі з імі старэйшыя жанчыны з Тапчыкал, Арэшкава і Новай Волі. Песні аб студзеньскім паўстанні спявалі мужчыны з Дубяжына, а дуэт з Орлі заспяваў песню з грамадскай тэматыкай «Собралася бедна голота». Аказваецца, што ў нашым народзе

(Працяг на стар. 4)



Яго прыгожы, лірычны голас захапіў публіку і журы: пераможца «Беларускай песні — 73» у катэгорыі салістаў Аляксандр Бандарук.

БЕЛАРУСКАЯ П'ЕСА Ў БЕЛАСТОЦКІМ ТЭАТРЫ

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ МАКАЁНКАВАГА „ТРЫБУНАЛА"

Дзяржаўны тэатр імя Аляксандра Вянгеркі ў Беластоку, каб адзначыць 50-ую гадавіну заснавання СССР, вырашыў паставіць савецкую п'есу. Гродзенскія сябры падказалі кіраўніцтву беластоцкага тэатра паціцавіцца «ТРЫБУНАЛАМ» Андрэя Макаёнка. Гэтая п'еса выдатнага беларускага сучаснага драматурга якраз у той час заваёўвала тэатры Беларусі, Літвы, Расійскай федэрацыі і іншых савецкіх рэспублік. П'еса змястоўная, па-народнаму разумная і па-народнаму вясёлая. Максім Танк з трыбуны VI з'езду Саюза пісьменнікаў Беларусі сказаў, што ў ёй аўтару ўдалося найважнейшае: ён змог паказаць высокі, ніколі не пагасаючы патрыятызм і аптымізм простых людзей ды бязмежную сілу геройства народа і яго непадкупныя адносіны да ворага. Іншы выдатны беларускі пісьменнік Іван Шамякін гаварыў, што аўтар «Трыбунала» шукаў тэмы для сваёй п'есы не ў кніжках, а сярод народа, дзе вельмі часта геройскае і сур'ёзнае пераплятаецца вясёлым і смешным.

Дык вось і мы маем магчымасць пазнаёміцца з Макаёнкавым «Трыбуналам». У Беластоку ён проста штурмам аваладаў сэрцамі жыхароў горада. Яшчэ крытыкі і рэцэнзенты не паспелі адтрубіць пахвальныя гімнаў у адрас Макаёнка, а ўжо яго слава разнеслася вуснай поштай. І вось каторы ўжо дзень у касе тэатра не застаецца аніводнага білета. У Беластоку не часта такое бывае.

Я глядзеў «Трыбунал» у звычайны, рабочы дзень — у аўторак. Думаў, што сустрэну там так званую «арганізаваную публіку», якая нярэдка запаўняе тэатральную залу, бо не хацелася мне верыць, што вось так, па свайму жаданню беластачане выкупляюць усе білеты на гэты спектакль.

Не, арганізаванай публікі на зале не было. Гэта адразу кідаецца ў вочы. Яе запаўнялі людзі розныя па ўзросту і прафесіі.

Адкрылася заслона. Мы ўбачылі стылізаванае абсталяванне сялянскай беларускай хаты. Гэта заслуга мастака Эльжбеты Хояк. У хаце — беларуская сялянка Паліна, ролю якой іграе тут актрыса *Марыя Хадэцкая*, і Зіна, нявестка Паліны, якую прадстаўляе *Эва Радзікоўская*.

(Працяг на стар. 3)



Адна з апошніх сцэн Макаёнкавага «Трыбунала» ў выкананні калектыву Беластоцкага тэатра. Злева: Крыстына Алясевіч (Галя), Эва Радзікоўская (Зіна), Анна Бараноўская (Надзя), Вітальд Галонзка (Цярэшка) і Мар'я Хадэцкая (Паліна).
Фота Ст. Дукевіч

БГКТ ХРОНІКА

■ 28 лютага члены этнаграфічнай камісіі ГП з удзелам старшыні ГП Міколы Самоціка падрыхтавалі праект перадачы пад дзяржаўную адміністрацыю беларускага этнаграфічнага музея ў Белавежы, які атрымае памяшканне па прыроднязнаўчым музеі. У праекце гаворыцца, між іншым, аб неабходнасці ўтварэння яшчэ двух аддзелаў — археалогіі і гісторыі.

■ 2 сакавіка на чарговым пасяджэнні прэзідыума ГП БГКТ старшыня ГП Мікола Самоцік прачытаў праект даклада на набліжаючыся пленум, які будзе прысвечаны працы аддзелаў з актывам і які адбудзецца 1 красавіка. З прапановай увядзення некаторых паправак, даклад быў зацверджаны. Затым кіраўнік культурна-асветнага аддзела Валянціна Філіпюк прадставіла статыстычна-апісную справаздачу аб дзейнасці паасобных аддзелаў БГКТ у 1972 годзе. Далейшым пунктам пасяджэння былі справы музея ў Белавежы. Прысутныя разгледзелі праект прапанову членаў этнаграфічнай камісіі адносна передачы экспанатаў музея пад адміністрацыю акруговага музея ў Беластоку і падрыхтавалі ў гэтай справе пісьмо да Прэзідыума ВРН. Прэзідыум ГП разгледзеў таксама некаторыя кадравыя справы Беларускага таварыства.

■ 2 і 3 сакавіка кінапрасоўкай ГП дэманстраваліся два савецкія фільмы «Сыновья уходят в бой» і Бриллиантовая рука» ў Клюковічах, Вульцы Нурэцкай і Снежках у Сямяціцкім павеце.

■ Пасяджэнне Прэзідыума гарадскога аддзела БГКТ (2.III.) у Беластоку адбылося супольна з членамі рады клуба і актывістамі аддзела. Было пастаноўлена аднавіць раду клуба, падрыхтаваць «рэгулямін клуба», каляндар мерапрыемстваў і супольна апрацоўваць планы працы праўлення аддзела. Прысутныя ў шчырай размове выказалі шмат заўваг адносна дзейнасці клуба. Затым прэзідыум разглядзеў 16 дэкларацый, падпісаных асобамі, якія выказалі сваё жаданне стаць членамі БГКТ. Усе яны былі прыняты ў рады нашай арганізацыі.

■ Нядаўна член праўлення гайнаўскага аддзела БГКТ Іван Цыванюк згодна з прыдзеленымі яму абавязкамі абслужыў сходы гурткоў БГКТ у Луцэ і Тарнопалі. А член праўлення Аляксандр Харкевіч быў на сходзе гуртка БГКТ у сваёй вёсцы Ляўшкі. У гэтых гуртках усе члены БГКТ у 100% аплацілі членскія складчыны за 1973 год.

■ Па ініцыятыве гайнаўскага аддзела БГКТ арганізавана спаборніцтва паміж пісьманосцамі па паве-

(Працяг на стар. 3)

Падзеі ◇ Здарэнні ◇ Факты ◇ Каментарыі ◇ Весткі

СВЕТ | БССР | ПОЛЬШЧА | ВАЯВОДСТВА

ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА Ў ЧССР

У сувязі з тым, што ў сакавіку 1973 года канчаецца тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, Прэзідыум Федэральнага сходу ЧССР прыняў рашэнне склікаць 22 сакавіка сумеснае пасяджэнне народнай палаты і палаты нацыянальнасцей Федэральнага сходу ЧССР для выбараў прэзідэнта рэспублікі.

У адпаведнасці з канстытуцыйным законам аб чэхаславацкай федэрацыі прэзідэнта ЧССР выбіраюць на сумесным пасяджэнні абедзве палаты Федэральнага сходу ЧССР.

МЕНШАЯ АПЛАТА

Паводле даных Міжнароднага бюро працы, розніца ў зарплаце мужчын і жанчын складае ў Францыі 17,1 працэнта, у Швецыі — 24 працэнты, у ФРГ — 31,3 працэнта, у Японіі — больш за 50 працэнтаў. У ЗША за кошт недаплаты жанчынам за працу, роўную мужчынскай, прадпрыемцы атрымліваюць да 40 працэнтаў дадатковага прыбытку. Негрыцянкам плоцяць у два разы менш, чым белым жанчынам, і на тры чвэрці менш, чым мужчынам. Закон аб роўнай аплаце мужчынскай і жаночай працы, прыняты ўрадам ЗША ў 1964 годзе, фактычна не ажыццяўляецца. У Англіі такі закон павінен уступіць у дзеянне толькі ў 1975 годзе.

ПАД СУД

Члены палесцінскай тэрарыстычнай арганізацыі «Чорны верасень», якія захапілі 1 сакавіка пасольства Саудыйскай Аравіі ў Хартуме і забілі трох дыпламатаў, узятых імі ў якасці заложнікаў, будуць аддадзены пад суд.

КІРМАШ У БРНЕ

Фірмы і прадпрыемствы 32 краін прымуць удзел у чацвёртым Міжнародным кірмашы тавараў шырокага спажывання, які адбудзецца ў Брне (Чэхаславакія) з 7 па 15 сакавіка гэтага года.

ПРЫЁМ БРЭЖНЕВЫМ ПАСЛА ЯПОНІІ

Японскія газеты на першых старонках змясцілі паведамленне аб прыёме Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. Брэжневым пасла Японіі ў СССР, падкрэсліваючы, што Генеральны сакратар ЦК КПСС упершыню прыняў афіцыйнага прадстаўніка японскага ўрада.

Прыём Л. Брэжневым японскага пасла, адзначыла «Токіо сімбун», разглядаецца ў Японіі «як праяўленне таго, што Савецкі Саюз надае важнае значэнне Японіі».

СІСТЭМА «МІР»

Дваццаць высокавольтных магістральных ліній электраперадачы, якія працягнуліся на многія тысячы кіламетраў, агрэгаты агульнай магутнасцю больш чым 58 мільёнаў кілават — такая цяперашняя магутнасць аб'яднанай энергетычнай сістэмы «Мір» еўрапейскіх дзяржаў — членаў СЭУ: Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі і Савецкага Саюза. Яе галоўная задача — у найбольш поўнай меры і з найменшымі стратамі задавальняць патрэбнасці ў энергіі народных гаспадарак брацкіх краін. (ак)

1973 ГОД — ДАТЭРМІНОВА

Калектывы прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, транспарту і сувязі, калгасаў і дзяржаўных гаспадарак, прадпрыемстваў гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР, усебакова ацэньваючы дасягнутыя вынікі мінулага года, прынялі на 1973 год наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

Гадавы план па аб'ёму рэалізацыі прадукцыі выканаць датэрмінова 26 снежня 1973 года.

Атрымаць у калгасах і саўгасах з гектара пасеву: збожжавых — не менш чым 24 цэнтнеры, бульбы — 152, цукровых буракоў — 235, ільноваланка — 5 цэнтнераў.

ЛУКОМЛЬСКАЯ ЎДАРНАЯ

Лукомльская ДРЭС — ударная камсамольская будоўля Беларусі. Напярэдадні 1973 года гэты флагман беларускай энергетыкі дасягнуў магутнасць у паўтара мільёна кілават. Сталася гэта дзякуючы ўводу ў дзеянне чарговага пятага энергаблока.

Варта прыпомніць, што пабудова Лукомльскай электрастанцыі распачалася ў лютым 1964 года. Разам з карпусамі ДРЭС рос новы горад. Цяпер у Новалукомлі жыве 12 тысяч чалавек. Сярэдні ўзрост яго жыхароў — 23 гады, а па прафесіі найбольш у Новалукомлі энергетыкаў і будаўнікоў.

Лукомльская ДРЭС будзе разбудавана да магутнасці 5 мільёнаў кілават.

МЕТАДАМ НАРОДНАЙ БУДОВЫ

На Мінскім аўтамабільным заводзе шырокае развіццё атрымала ўзвядзенне дамоў метадам народнай будовы. У ім удзельнічаюць тысячы інжынераў, служачых і рабочых прадпрыемства. Грошы на будаўніцтва выдзяляюцца ад прыбытку завода. З 1954 года аўтазаводцы пабудавалі такім метадам 1820 кватэр.

НА ЭКСПАРТ

Мінскі электратэхнічны завод імя В. Казлова ў мінулым годзе адправіў у Егіпет каля трох тысяч камплектных трансфарматарных падстанцый, якія былі спраектаваны і выраблены з улікам асаблівасці іх эксплуатацыі ва ўмовах высокіх тэмператур і павышанай запыленасці. Усяго да канца пяцігодкі завод адправіць у АРЭ звыш 15 тысяч такіх падстанцый.

АДАМ МІЦКЕВІЧ І ШАШКІ

У лютаўскім нумары беларускага часопіса «Маладосць» знаходзім цікавыя заўвагі майстра спорту СССР Мікалая Грушэўскага аб адносінах вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча да гульні ў шашкі.

«А. Міцкевіч, — адзначае М. Грушэўскі, — бачыў у шашках перш за ўсё цікавы занятак і добрую магчымасць карысна правесці час, калі на дварэ гуляе завіруха, альбо імжыць дождж. Лічыў ён, што шашкі даюць вялікі зарад бадзёрасці і цудоўнага настрою». Майстар спорту СССР прыпамінае, што А. Міцкевіч з'яўляецца аўтарам паэмы «Шашкі». (вр)

РАСПАЧАЛІСЯ ВАЯВОДСКІЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

Першая ваяводская справаздачна-выбарная канферэнцыя ПАРП адбылася ў Катавіцах. Прысутнічаў на ёй Эдвард Герэк, які быў дэлегатам на катавіцкую канферэнцыю.

Катавіцкая партыйная арганізацыя належыць да перадавых у краіне. Гэта раён вялікай прамысловасці. Рабочы клас тут моцна з'яднаны пад ідэямі партыі. Катавіцкая арганізацыя ПАРП налічвае звыш 300 тыс. членаў. Дыскусія была вельмі багатая і канцэнтравалася вакол гаспадарчых спраў. Найбольшыя сённяшнія інвестыцыі раёна — гэта гута «Катовіцэ», фабрыка малалітражных самаходаў, разбудова рыбніцкай вугальнай акругі «РОВ».

На канферэнцыі выступіў І сакратар ЦК ПАРП Эдвард Герэк. Як заўсёды, выступленне І сакратара было канкрэтнае, багатае, шчырае і дадаючае сіл для далейшай працы. Ён моцна падкрэсліў ролю рабочага класа і яго авангарду — партыі для развіцця нашай краіны. Асаблівая актывізацыя рабочых праявілася пасля VI з'езду партыі. Тав. Э. Герэк сказаў, між іншым: «Мы пачалі вялікую работу па аднаўленню дзяржаўнай адміністрацыі на вёсцы. Многа яшчэ трэба зрабіць, каб умацаваць новыя гміны, каб знайсці добрыя формы іх працы, каб злучыць усе элементы прадукцыйнага, грамадскага і культурнага развіцця вёскі. Гэта цяпер галоўнае заданне партыйных камітэтаў і дзяржаўных органаў на вёсцы».

Таксама ў мінулым тыдні адбылася другая ваяводская канферэнцыя — у Аполі, дзе працуе 76-тысячная партыйная ваяводская арганізацыя. Стаяла тут справа прамысловага і сельскагаспадарчага развіцця раёна. Апольскае ваяводства з'яўляецца адным з найлепшых, найбольш прадукцыйных сельскагаспадарчых раёнаў у Польшчы. На канферэнцыі прысутнічалі старшыня Рады Дзяржавы праф. Г. Яблонскі і сакратар ЦК Ф. Шляхціц.

ПРЭМ'ЕР ФІНЛЯНДЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ

Па запрашэнню прэм'ера ПНР Пятра Ярашэвіча прыязджаў у Польшчу з афіцыяльным візітам прэм'ер Фінляндыі Калеві Сорса. Размовы госця з нашымі ўладамі датычылі міжнароднай сітуацыі (Фінляндыя вядома сваімі мірнымі ініцыятывамі) і польска-фінляндскага супрацоўніцтва. Быў падпісан дагавор ад культурным і навуковым супрацоўніцтве.

Прэм'ера Фінляндыі прыняў І сакратар ЦК партыі Э. Герэк і старшыня Рады Дзяржавы ПНР Г. Яблонскі. Адзін дзень Калеві Сорса адпачываў у Закапаным.

V З'ЕЗД ЗГП

Саюз польскіх гарцэраў налічвае 2 мільёны членаў — зухаў, гарцэраў і інструктараў. Да ЗГП належыць 63 працэнты вучняў пачатковых школ на вёсцы і 34 працэнты ў горадзе. Найбольшая гарцэрская харугвія ёсць у Катавіцкім ваяводстве — 182 тысячы членаў.

З вялікім плёнам польскія гарцэры прыйшлі на свой V з'езд, які адбыўся ў Варшаве. Прыехала 817 дэлегатаў. Даклад прадставіў начальнік ЗГП С. Багдановіч. Выступіў таксама прафесар Г. Яблонскі, які з'яўляецца старшынёй галоўнай рады гарцэрства. (вл)

ПЛЕНУМ ВК ПАРП У БЕЛАСТОКУ

У суботу, 10 сакавіка, у Беластоку адбыўся пленум Ваяводскага камітэта ПАРП, прысвечаны абмеркаванню і зацвярджэнню справаздачы ВК ПАРП на XIV ваяводскую справаздачна-выбарную канферэнцыю ПАРП, якая адбудзецца ў пачатку красавіка. Пленум адбыўся пасля сходаў у падставовых партыйных арганізацыях і павятовых справаздачна-выбарных канферэнцый. Справаздачу аб працы ваяводскай партыйнай арганізацыі за мінулыя два гады прадставіў сакратар ВК ПАРП Уладзіслаў Юшкевіч. Сакратар ВК Яўгеній Златажынскі прадставіў праект праграмы святкавання XXX гадавіны ПНР на Беласточчыне.

ВЯЛІКІ КОНКУРС «ГАЗЕТЫ БЕЛАСТОЦКАЙ».

Беластоцкае ваяводства мае падставы, каб ганарыцца сваімі дасягненнямі. Доказам гэтага можа быць тое, што менавіта ў нашым ваяводстве адбудуцца ў гэтым годзе цэнтральныя дажынкі. Для ўсіх нас вельмі важна, каб Беласток і ўсё ваяводства зрабілі як найлепшае ўражанне на сваіх гасцей. Таму «Газета Беластоцкая» абвясціла вялікі конкурс на найлепшыя ідэі адносна арганізацыі цэнтральных дажынак. Было б вельмі добра, каб свае прапановы падало як найбольш жыхароў Беласточчыны. Галоўная іх задача — выказаць сваю думку аб тым, як, якім спосабам паказаць гасцям дасягненні нашай сельскай гаспадаркі, прамысловасці, культуры, як упрыгожыць горад, вітрыны магазінаў, як паказаць дасягненні беластоцкай навуковай і тэхнічнай думкі, як разрэкламаваць прыгажосць і свежасць нашых краявідаў і г.д. Першыя прапановы жыхароў Беласточчыны змясціла ўжо «Газета Беластоцкая» ад 10 сакавіка 1973 года. Пераможцаў конкурсу чакаюць цікавыя і каштоўныя ўзнагароды.

ВАЯВОДСКІ З'ЕЗД РАМЕСНІКАЎ

У пятніцу, 9 сакавіка ў Доме рамесніка адбыўся ваяводскі з'езд рамеснікаў. У з'ездзе прыняло ўдзел шмат гасцей, а, між іншым, член экзекутывы ВК ПАРП, намеснік старшыні Прэзідыума ВРН Уладзімір Міхалюк, старшыня ВК СД Здзіслаў Пукорскі і іншыя. У дыскусіі на з'ездзе шмат увагі было прысвечана шырэйшаму супрацоўніцтву рамесных арганізацый з гмінамі. Супрацоўніцтва гэтае дазволіць лепш выкарыстаць паслугова-прадукцыйны патэнцыял рамесных варштатаў з карысцю для ваяводства.

УЛАДЗІСЛАЎ КОМАР У БЕЛАСТОКУ

Па традыцыі ў сакавіку ўрачыста адзначаем Дні алімпійца. У Беластоку галоўнае мерапрыемства адбылося 12 сакавіка ў кінатэатры «Звёнзковец». Адбылася сустрэча з залатым медалістам алімпіяды ў Мюнхене Уладзіславам Комарам. Сустрэчу вёў рэдактар Яцэк Жэмантоўскі.

ЦУКРОЎНЯ Ў ЛАПАХ — ПРАЗ 500 ДЗЁН

Будаўнікі, якія працуюць на будове цукроўні ў Лапах, абавязаліся закончыць будову 22 ліпеня 1974 года, гэта значыць, на два месяцы раней плана. Такое абавязацельства прынялі яны ў сувязі з 30-годдзем ПНР. (ач)



NIEDZIELA 18.III.

7.30 Program dnia. 7.35 TV Kurs Rolniczy 8.10 „Przypominamy, radzimy". 8.20 „Alarm przeciwpożarowy trwa". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 TELERANEK. 10.20 „Muzy bez etatu" — mag. poświęcony ruchowi artystycznemu. 10.50 PKF. 11.00 „W starym kinie" — „Czarny pirat" — film arch. 12.00 Dziennik. 12.15 „Przemiany". 12.45 Dla dzieci: L. J. Kern — „Początek końca" odc. VII („Karampuk"). 13.20 „Zrodził nas czyn" — estrada publ. w rocznicę ZWM. 13.50 Losowanie numerów Totolotka. 14.00 „Turniej Politechnik" — finał. 15.10 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 18.10 „Kryteria". 18.25 „Piosenka dla Ciebie". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Wojna i pokój" — film fab. radz. cz. IV — „Pierre Bezuchow". 21.35 „Caregiele" czyli Ballady Jerzego Medyńskiego do muzyki Jerzego Wasowskiego. 22.10 Magazyn sportowy.

PONIEDZIAŁEK 19.III.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 13.55 Przerwa. 15.20 i 23.10 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla dzieci: „Zwierzyniec", „Obserwatorium". 17.25 „Echo stadionu". 17.50 TV Kurier Kielecki. 18.10 „Oferty". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: J. Słowacki — „Beatryks Cenci". 22.15 „Ex libris". 22.45 Dziennik.

WTOREK 20.III.

10.00 Dla szkół: (kl. IV) „Łowickie wycinanki". 10.20 „Wojna i pokój" — film fab. radz. cz. IV — „Pierre Bezuchow". 11.55 Dla szkół: (kl. IV lic.) Język polski — E. Ionesco „Nosorożec". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 17.45 Sprawozdanie z międzynarodowego meczu piłki nożnej Polska—USA. 18.45 POLITYKA DLA WSZYSTKICH. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Mały uciekinier" — film fab. USA. 21.30 Program dokumentalny. 22.00 „Wieczór z Diahann Carroll". 22.50 Dziennik. Wiadomości sportowe. 23.20 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 23.55 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin.

ŚRODA 21.III.

9.30 „Mały uciekinier" — film fab. USA. 10.55 Dla szkół: (kl. V) Historia— „Polska pierwszych Piastów". 11.55 Dla szkół: (kl. VIII) Fizyka — „Pole magnetyczne". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt". 14.00 „Wybieramy zawód". 15.20 i 23.05 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Spotkanie na trampolinie". 17.10 Dla dzieci: „Małe kino". 17.35 „Informacje, Towary, Propozycje". 17.55 „Sylwetki X Muzy" — Wojciech Kilar. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Postawy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Miłość" („Opowieści mojej żony"). 20.25 „Spisek Maleta" — film franc. („Szpieg cesarza") odc. VI. 21.20 „Świat i Polska". 22.05 „Konkurs" rep. z Międzyn. Konkursu Skrzypcowego im. H. Wieniawskiego w Poznaniu. 22.35 Dziennik. Wiadomości sportowe.

CZWARTEK 22.III.

9.55 „Spisek Maleta" — film franc. (Szpieg cesarza") odc. VI. 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Język polski — „Stanisław Moniuszko". 11.55 Dla szkół: (kl. IV lic.) Język polski — „Konstanty Ildefons Gałczyński". 14.00 Matematyka w szkole: „Mnożenie i dzielenie liczb" cz. I. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 PKF. 17.55 „Bursianie, bursiańska śleboda" („Zwyczaje i obrzędy"). 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Śląskie trójmiasto". 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Taryfa nocna" — film fab. franc. 21.40 „Wiosna 73". 22.15 „Ekspress nr. 22". 22.45 Dziennik. Wiadomości sportowe. 23.15 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 23.50 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt.

PIĄTEK 23.III.

8.25 „Taryfa nocna" — film fab. franc. 9.55 Dla szkół: (kl. I-III lic.) Wychowanie techniczne — „Technika w rolnictwie". 10.55 Dla szkół: (kl. III) „Cywil, Szarik i inne". 11.55 Dla szkół: (kl. V) Historia — „Polska pierwszych Piastów". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 15.20 i 23.00 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 „Nie tylko dla pań". 17.45 „Śpiewa Elżbieta Poniatowska". 18.15 „Turystyka i wypoczynek". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Orbita". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Kominiarz przynosi szczęście" — program rozr. radz. 20.35 Panorama Tygodnia. 21.15 Teatr TV: M. Gogol — „Płaszcz". 22.30 Dziennik. Wiadomości sportowe.

SOBOTA 24.III.

9.10 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Dama Kameliowa". 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Geografia — „Mongolia". 14.15 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne. 14.50 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Starcie" — Czy lubisz poezję?. 17.40 „Spotkania z przyrodą". 18.10 „Bieg po zdrowie". 18.35 „Pegaz". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 Teatr Rozrywki: W. Dychawiczny i M. Słobodskoj oraz W. Massa i M. Czerwiński — „Debiutantka" — wodewil. 21.45 Dziennik. Wiadomości sportowa. 22.15 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Dama Kameliowa".



Piątek, 16 marca

8.45 Film. fab. 11.10 Szkoła szachowa. 11.40 Filmy dokument. 14.00 Program dnia. 14.35 Koncert. 16.50 Film animowany dla dzieci. 17.30 Film fab. 19.00 Czas. 19.30 Koncert M. Magomajewa. 20.30 Balet.

Sobota, 17 marca

7.00 Program dnia. 7.30 Białe i czarne. 8.00 Przegląd międzynarodowy. 10.25 Stare filmy. 12.45 Filmy animowane. 13.30 Zdrowie. 14.00 Ekran i czas. 15.10 Film animowany dla dzieci. 16.10 W świecie zwierząt. 17.30 Spektakl TV. Część I. 19.00 Czas. 19.30 Spektakl TV. Część II. 21.00 Program sportowy.

Niedziela, 18 marca

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 9.00 Film animowany. 9.30 W eterze „Młodość". 11.00 Film fab. 13.40 Piosenka — 73. 15.00 Klub filmowy. 16.40 Koncert. 17.40 Film fab. 19.00 Czas. 19.30 Film TV. 21.00 Program sportowy.

Пачатак на стар. 1

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ МАКАЁНКАВАГА „ТРЫБУНАЛА”

Паяўляецца галоўны герой гэтай п'есы, Цярэшка Калабок (яго ролю ў Беластоку выконвае Віталь Галонзка), былы калгасны пастух, бацька дванаццаці дзяцей. Ён аб'яўляе жонцы, што менавіта яго выбралі нямецкім солтысам.

І зноў смех, бо выгляд Цярэшкі пярэчыць усялякім уяўленням аб лютай гітлераўскай уладзе. Першапачаткова яго сям'я таксама не можа паверыць, каб іх бацька мог прадаць душу фашыстам. Калі аднак прыходзяць на абед нямецкі камендант (Юльюш Пшыбыльскі) і мясцовы паліцай Сырадоеў (Ежы Сех) і пачынаюць піць «за здароўе» солтыса Калабка, усё становіцца ясна. Сям'я аднак не можа яму гэтага дараваць. Тры яго сыны і два зяці ваююць з фашыстамі на фронце, а ён... Сямейны «т р ы б у н а л» выносіць прыгавор: утапіць Цярэшку ў сажалцы.

Гэтая п'еса ставіць нялёгкія задачы перад акцёрамі і рэжысёрамі. У знешніх абставінах сялянскага прымітывізму ідзе гутарка аб самых карэнных прынцыпах чалавечага быту: як чэсна і сумленна прайсці праз жыццё, як служыць іншым, як цаніць свабоду сваёй радзімы? Штораз гучыць у п'есе рэха Гамлетаўскага «быць ці не быць». У гэтым сэнсе загаловак п'есы «Трыбунал» траціць сваё сатырычнае гучанне і прымае значэнне шмат шырэйшае, агульначалавечае.

Перакладчык п'есы Лех Пятроўскі ў праграме да гэтага спектакля піша, што Макаёнкаў твор адначасна да універсальных праблем чалавека, што гэтыя праблемы былі і будуць актуальныя ў кожным часе і пад кожным небам; ён прыносіць глыбокі аналіз хістанняў і канфліктаў сумлення ў людзей, якіх лёс прымусіў прыняць цяжкія і неадназначныя рашэнні.



— Будзеш ты служыць фашыстам?! — звяртаецца Паліна (Мар'я Хадзецкая) да свайго мужа Цярэшкі (Віталь Галонзка).

Калектыў беластоцкага тэатра выдатна справіўся з гэтымі складанымі праблемамі. Тут відаць вопытная рука рэжысёра Збігнева Бесерта. Асабліва добра паставіў ён ролю Цярэшкі Калабка. Нялёгка іграць дурака, але іграць так, каб публіка была пераканана, што гэта р а з у м н ы дурань. Віталь Галонзка ў гэтай ролі па-мужыцку і хітры, і адважны, і ўпарты, і наіўны, і сентыментальны, але ніколі н е с м е ш н ы.

А Паліна? У Макаёнка гэта ж не проста вясковая жанчына, а маці-гераіня, амаль што сімвал непакорнай Савецкай Радзімы. Марыя Хадзецкая іграе гэтую ролю натуральна і спакойна, без лішняга пафасу.

Іншыя акцёры таксама добра справіліся са сваімі заданнямі. Напрыклад, Ю. Пшыбыльскі ў труднай ролі нямецкага каменданта быў дасканалым прадстаўніком арыйца, «іберменша». Крыстына Алясевіч у маўклівай ролі Галі ўвасабляла тыповую беларускую сялянку, якая мала гаворыць, а сваё і так зробіць.

Найбольш трагічна канчаецца ў п'есе лёс Валодзі, Цярэшкавага сына, які ізноў не мог пайсці ў Савецкую Армію. Ён тут прадстаўнік маладога, нецярплівага пакалення, якое прайшло піянерскае выхаванне. Яцэк Даманскі мог бы болей пераканаўча прадэманстраваць яго глыбокі боль ад уяўнага прадажніцтва бацькі, яго вернасць савецкай уладзе і яго рашучасць, каб уласнай крывёю змыць бацькоўскую ганьбу.

Перакладчык перакладаў «Трыбунал» не з арыгіналу, а з рускай мовы. Трэба было добра папрацаваць, каб не страціць багацця жывой народнай мовы А. Макаёнка. Леху Пятроўскаму аднак пераклад удаўся. Сярод публікі часта даводзілася чуць: «Дыялагі цудоўныя! Ад смеху аж жывот баліць».

Гэта першая беларуская п'еса, пастаўленая беластоцкім тэатрам, і надоўга застанецца яна ў яго рэпертуары.

Віктар Рудчык

БЕЛАРУСІЯНА

МІНІЯЦЮРЫ ЯНКІ БРЫЛЯ

Польскі грамадска-літаратурны тыднёвік «Літаратура» ад 15 лютага гэтага года змясціў падборку літаратурных мініяцюр вядомага беларускага сучаснага пісьменніка Янкі Брыля. Яны ўзяты са зборніка «Жменя сонечных промняў», які выдавецтва «Беларусь» выпусціла яшчэ ў 1965 годзе. Знаходзяцца ў ім сапраўдныя жамчужыны думак пісьменніка аб штодзённасці Савецкай Беларусі, аб яе сённяшніх жыхарах, аб іх перажываннях, аб звычайных падзеях, якія ў творах Янкі Брыля раптам прымаюць шырэйшае, як бы агульначалавечае значэнне, выяўляюць свой філасофскі падтэкст. Мова гэтых мініяцюр — простая, народная, а сказы падабраны так трапна, што гэтыя нескладаныя празаічныя творы гучаць, як лепшыя вершы.

У перакладзе гэтага, на жаль, не адчуваецца, але Ян Гушча — вядомы перакладчык беларускай літаратуры — вельмі салідна папрацаваў над гэтымі Брылевымі мініяцюрамі.

Тыднёвік «Літаратура» змясціў іх 11. Ужо гэтая надта ж скромная падборка дае нейкае ўяўленне аб мастацкай спраўнасці і жыццёвай прынцыповасці аўтара гэтых «сонечных промняў». (вр)

Пачатак на стар. 1

БГКТ ХРОНІКА

лічэнню падпіскі «Нівы». З інспектаратам асветы падобнае спаборніцтва арганізавана паміж школамі, дзе навучаецца беларуская мова. Напрыклад, у Тыневічах ужо ўсе школьнікі з'яўляюцца падпісчыкамі «Нівы».

■ Гурток БГКТ у Слоі, што на Сакольшчыне, быў ініцыятарам стварэння тэатральнага калектыву. Гэты калектыў падрыхтаваў п'есу «Ветэрынар панявольні» і выступіў з ёю перад жыхарамі сваёй вёскі.

■ Сельскагаспадарчы гурток у Гаркавічах (Сакольскі павет) для сваіх больш як 20-ці членаў зрабіў гадавую падпіску «Нівы». Варта адзначыць, што існуе тут добрае супрацоўніцтва гуртка БГКТ з сельскагаспадарчым гуртком. Усе мерапрыемствы ў вёсцы арганізоўваюцца супольна і заўсёды праходзяць яны добра і цікава.

■ Самадзейнікі з Сакоў у Бельскім павеце (усе яны члены БГКТ) сталі вельмі папулярныя. Маюць яны ў сваім рэпертуары дзве п'есы «10 гектараў» і «Люцынка-інжынерыха», з якімі выступалі ўжо ў сваёй вёсцы, у Мокрым, Галадах і Ласінцы. Прымуць яны таксама ўдзел у павятовым аглядзе тэатральных калектываў БГКТ, які адбудзецца 18 сакавіка ў Бельску Падляшскім.

■ Гурток БГКТ у Агароднiках стварыў тэатральны калектыў, які падрыхтаваў таксама дзве п'есы «Люцынка-інжынерыха» і «Вываражыла». Гэты гурток паедзе на агляд у Бельск Падляшскі.

■ Да павятовага агляду драматычных калектываў рыхтуюцца самадзейнікі з Мокрага (п'еса «Толькі так»), з Малочкаў (п'еса «Пінская шляхта»), з Снежкаў (п'еса «Люцынка-інжынерыха»).

■ Гурток БГКТ у Васількове (каля Беластока) на сваім сходзе прыняў у рады Беларускага таварыства 6 новых членаў.

■ Жанчыны з Меляшкоў (Беластоцкі павет) пад кіраўніцтвам настаўніцы Зінаіды Літвін падрыхтавалі п'есу «Мікітаў лапаць» і кампазіцыю вясковага вяселля на аснове мясцовых традыцый і песень. З лютага выступілі яны на сваёй вясковай сцэне 2 разы. Асабліва «Вяселле» ўсім спадабалася. У гэтай пастаноўцы выступіла 17 жанчын, якія таксама выконвалі ролі мужчын. З «Вяселлем» меляшкоўцы выступяць на павятовым аглядзе драмгурткоў БГКТ. Пасля мастацкіх выступленняў 16 жанчын падпісалі дэкларацыі БГКТ і гэтым самым гурток павялічыўся да 27 асоб. Ганаровымі госцьмі ў Меляшках былі старшыня павятовага беластоцкага аддзела БГКТ Янка Цялушэцкі і інструктар ГП Геня Іванюк.

■ Гурток БГКТ у Коматаўцах (Беластоцкі павет) супольна з гуртком вясковых гаспадынь стварылі два мастацкія калектывы — драматычны і харавы. Драматычны калектыў 4 сакавіка выступіў з п'есай «Вываражыла». 16-асабовы харавы калектыў пад кіраўніцтвам Івана Мікуця выканаў дзесяць беларускіх, украінскіх і рускіх песень. На вечар мастацкай самадзейнасці прыбылі старшыня аддзела Янка Цялушэцкі і інструктар ГП Геня Іванюк.

■ Гурток БГКТ у Бабровніках (старшыня Марыя Кузьміч) у 100 працэнтах аплаціў членскія складчыны.

■ Пад мастацкім кіраўніцтвам настаўніцы Валянціны Мароз рыхтуецца да павятовага агляду тэатральных калектываў гурток БГКТ у Паўлах. Выступіць ён з п'есай Барыса Сачанкі «Нач няволі».

■ 4 сакавіка павятовыя ўлады Беластоцкага павету арганізавалі ў Гарадку конкурс на савецкую песню. Удзельніцы гарадоцкага хору БГКТ Ірэна Кардаш і Марыся Міруць у партыі дуэтаў занялі першае месца. (мх)

Фільмовы клуб у Міхалове


Гмінны цэнтр культуры ў Міхалове развівае ўсебаковую дзейнасць. У мінулым годзе быў тут створаны дыскусійны фільмовы клуб. ДКФ згуртоўвае 150 членаў. Збіраецца тут моладзь і дарослыя, каб паглядзець кінакарціну, падыскутаваць аб праблематыцы фільма, аб акцёрах.

Нядаўна на сустрэчу ў Міхалова прыехаў вядомы рэжысёр польскіх фільмаў Януш Маргенштэрн і кінаакцёр Уладзіслаў Кавальскі. Была паказана карціна Маргенштэрна «Трэба забіць гэтую любоў», дзе адну з асноўных роляў выконвае У. Кавальскі. Асобу Маргенштэрна, як і Кавальскага, ведаюць многія з серыйнага тэлевізійнага фільма «Калумбы». Сустрэча была і цікавай, і карыснай, ну і сатысфакцыя немалая. Можна было задаць пытанні непасрэдна аўтару фільма, параўнаць свае адчуцці з імкненнямі рэжысёра.

Гаворачы пра міхалоўскі ДКФ, нельга не заўважыць, што гэта зусім новая форма культурнай працы на вёсцы, форма, якая дагэтуль была характэрна толькі для гарадскога асяроддзя.

Фільмовы клуб узнік па ініцыятыве кіраўніка ГОК-у. Ініцыятыву падтрымалі іншыя арганізацыі, а сярод іх мясцовы гурток БГКТ. Такую дзейнасць бэгэкатоўцаў трэба пахваліць. Трэба якраз супольна з іншымі арганізоўваць цікавыя і карысныя мерапрыемствы.

Тэкст і фота А. Карпюка



Рэжысёр Я. Маргенштэрн: «я... хацеў зрабіць фільм іншы ад «Калумбаў».



Дыскусія ішла вока ў вока. Першы злева акцёр Ул. Кавальскі.

КОНКУРС ПЦК на ганаровых крывядаўцаў

Ваяводскае праўленне ПЦК у Беластоку аб'явіла конкурс на вярбунак ганаровых крывядаўцаў. У конкурсе могуць прыняць удзел усе вясковыя пункты аховы здароўя. Конкурс будзе праццягвацца да вясны 1974 года і датычыць ён вясковых крывядаўцаў.

Справа ў тым, што вёска ўсё больш карыстае з крыві як каштоўнага лякарства, а мала тэтай крыві аддае на патрэбы шпіталяў. Таму вельмі важна, каб усе пункты аховы здароўя і ўсе лекары мабілізавалі на сваёй тэрыторыі як найбольш людзей, якія хоць па адным разе аддалі б сваю кроў на патрэбы хворых. Трэба помніць, што хвароба можа прыйсці да кожнага і кроў як найбольш пэўны лек выратуе яго жыццё.


Удзельнікаў конкурсу чакаюць багатыя ўзнагароды. (вл)

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

ЖАРТОЎНАЯ

Allegretto





Чэрэз сад, вінаград, чэрвоные вішні —
Ох, дай Бог мужыка под мае жэ мыслі.
Ох, дай Бог мужыка под мае жэ мыслі.
Штоб гарэлкі ні піў, табакі ні нюхаў,
Чужых жонак ні любіў, толькі міне слухаў.
Чужых жонак ні любіў, толькі міне слухаў.
Чэрэз сад, вінаград, чэрвоные вішні —
Ой, ні любіць міне той, што под мае мыслі.
Ой, ні любіць міне той, што под мае мыслі.
Толькі любіць міне той, што з роду ні знала —
То за тые пэрэборы, што пэрэбірала.
То за тые пэрэборы, што пэрэбірала.
Чэрэз сад, вінаград, чэрэз бамбарынку —
Везе стары, бородаты молодую жонку.
Везе стары, бородаты молодую жонку.
І везе, і несе, обецуе біці —
Пытаецца добрых людзі, што з ёю робіці.
Пытаецца добрых людзі, што з ёю робіці.
Ні ее біць, ні прыбіць, сама ні нагнецца —
Як увідзіт кавалераў, то ўбакі бярэцца.
Як увідзіт кавалераў, то ўбакі бярэцца.
Ні дай Бог свіне рог — старому жаніцца —
Маладая ні пойдзёт — стара ні гадзіцца.
Маладая ні пойдзёт — стара ні гадзіцца.

Ад Аляксандры Грыцук, 1923 года нараджэння, вёска Калодна, Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 г. Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіў Эдуард Гойлік.

„БЕЛАСТОК" НА ВОЛЗЕ

Прыемна нам паведаміць нашым чытачам, што па слаўнай рацэ Волзе плавае ад 1959 года цеплаход, які называецца «БЕЛАСТОК».

Экіпаж гэтага цеплахода наладзіў у мінулым годзе сувязь з нашай рэдакцыяй. Нядаўна мы зноў атрымалі ліст ад Васіля Міхайлавіча Штокалава, які з'яўляецца капітанам цеплахода «Беласток». Адтуль мы ведаем, што яго экіпаж слаўна завяршыў мінулагодні навігацыйны сезон на Волзе і Каме. У гонар 50-годдзя заснавання СССР матросы ц/х «Беласток» прынялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Яны рашылі свае гадавыя заданні выканаць да 7 снежня і сэканоміць пры гэтым 30 тон паліва. Слова стрымалі, а нават больш, бо гадавы план выканалі яны на 15 дзён раней і сэканомілі пры гэтым аж 65 тон паліва.

Зіма спыніла навігацыю на рэках. Для экіпажа цеплахода «Беласток» не настаў аднак час бяздзейнага адпачынку. Праводзяць яны дакладны агляд свайго судна і яго шматлікіх механізмаў, рыхтуюцца да вясны, каб зноў панесці па водным шляху Волгі, Камы і іншых рускіх рэк імя нашага горада. Прыемна нам ведаць, што ц/х «Беласток» пастаянна перавыконвае свае заданні, што праслаўляе імя горада на невялікай рэчцы Белай.

Экіпаж цеплахода «Беласток» быў бы ўдзячны жыхарам Беластока і Беластоцкага ваяводства за лісты і паштоўкі. (вр)

Пачатак на стар. 1

„БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-73"

дрэмле вялікае багацце не толькі песень любоўнага ці абрадавага характару, але і палітычнага і грамадскага. Сёлетні агляд, як ніколі, паказаў, што песні, выконваемыя на мясцовым дыялекце, узбагачаюць каларыт і тэматыку мерапрыемства.

Найлепшыя салісты і калектывы атрымалі каштоўныя ўзнагароды, прызнаныя аддзелам культуры Прэзідыума ВРН, Ваяводскім праўленнем ЗМВ, Ваяводскім прадпрыемствам «Прэса—Кніга— Рух», Ваяводскім праўленнем ОСП і ВЗГС, а таксама галоўнымі арганізатарамі конкурсу ГП БГКТ і нашай рэдакцыяй.

* * *

Як гаворыцца, няма ружы без калючак.

Першая заўвага. Справа канцэртнай залы. Вядома было, што ў мінулым годзе зацікаўленне аглядам было велізарнае, а зала на Варшаўскай 11 не змяшчала ўсіх ахвотных паглядзець і паслухаць, аднак агляд ізноў быў арганізаваны тут. Зрэшты, калі выканаўца выцірае пот хустачкай, то і яму нялёгка: як тады сканцэнтравацца на выкананні песні?!

Глядач наш настолькі патрабуючы, што яму і гасцям варта было б даць надрукаваную праграму.

Вялікая разнастайнасць калектываў і выканаўцаў робіць нялёгкай працу журы. Можна было б спрачацца, якія песні мелі большую вартасць, ці больш сучасныя беларускія ў выкананні дасканалага квартэту з Плёсак, ці, напрыклад, фальклорнага, спяваючага на мясцовым дыялекце, апранутага ў старадаўнія цудоўныя ўборы старэйшых жанчын з Арэшкава. Па-мойму, кожны з іх меў сваю вялікую вартасць. Гэты год даказаў, што класіфікаванне выканаўцаў нават у трох катэгорыях не вырашае справы.

Дык што ж рабіць? Здаецца, што мерапрыемства «Беларуская песня» настолькі разраслося і ўзбагацілася, што можа яно смела стаць фестывалем. І не таму прымяняю гэтае слова, каб зрабіць яшчэ адзін фестываль у Польшчы, але таму, што гэтае слова імення абазначае ўрачыстасць, якая складаецца з некалькіх артыстычных мерапрыемстваў падобнага характару. Неабходна было б тут вылучыць фальклорную песню. Яна з'яўляецца скарбніцай культуры нашага народу. Можна было б падумаць аб сцэнарыі для фальклорных калектываў. Гэта дало б намнога лепшыя эфекты выступленняў.

Урэшце трэба на будучыню ліквідаваць рэчавыя ўзнагароды, з якімі спачатку маюць цяжкасці купляючыя, а потым атрымліваючыя. Бо што ж вясковай жанчыне з настольнай лямпы (стылізаванай на старынную), калі ў яе хаце часта ёсць прыгажэйшая арыгінальная лямпа. Прапаную ўвядзенне кніжак ПКО ці бонаў у якасці ўзнагароды. Адначасова прапаную ўвесці сталую сімвалічную ўзнагароду, якая б мела сваё сімвалічнае названне.

Варта было б таксама разгледзець справы так званай рытмічнай секцыі. Я ўпэўнены, што некаторыя спевакі, каб спявалі ў суправаджэнні рытмічнай секцыі, выглядалі б намнога карысней.

І апошняе. Калі арганізуем цэнтральнае мерапрыемства ў такім маштабе і з такой колькасцю ўдзельнікаў, дык дайма ім магчымасць, каб маглі спакойна зрабіць рэпетыцыю перад выступленнем.

А. Карпюк
фота аўтара.



Зала была занята да апошняга месца...

Беларуская літаратура

Нашаніўская пара

«НАША НІВА» Ў АЦЭНКАХ КРЫТЫКАЎ — ЧАСТКА IV

У апошнія гады паявілася ў беларускай літаратурнай крытыцы нямала прац, аўтары якіх стараюцца аб'ектыўна ацаніць ролю, характар і значэнне «Нашай нівы» ў развіцці беларускай літаратуры. У першую чаргу трэба тут назваць С. Александровіча, які апублікаваў дзве кнігі: «Гісторыя і сучаснасць» і «Пуцявіны роднага слова». У кнігах гэтых прывёў аўтар вялікую колькасць новых фактаў, звестак, інфармацый, дагэтуль не вядомых чытачам. Аднак і С. Александровіч услед за Л. Фіглоўскай моцна падкрэслівае існаванне ў «Нашай ніве» двух ідэйных лагераў. Александровіч, як і Фіглоўская, падкрэслівае наяўнасць барацьбы паміж гэтымі лагерамі. «У сувязі са спецыфічнымі асаблівасцямі і слабасцю нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі, пад адным дахам — на старонках тады адзінай беларускай газеты выступалі, спрачаліся і выказвалі свае думкі аўтары рознага светапогляду, рознага творчага кірунку, рознага таленту. Побач з пісьменнікамі рэвалюцыйнымі дэмакратамі (Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны і інш.) тут супрацоўнічалі прадстаўнікі буржуазнага ліберальнага кірунку (А. Уласаў, В. Ластоўскі). Таму тут адначасова суседзілі матэрыялы вострыя і бяззубыя, яркія і невыразныя па ідэйнай задуме, майстэрскія і сырыя» (С. Александровіч, Пуцявіны роднага слова, Мінск 1971 г., с. 216).

І так, Фіглоўская і Александровіч падкрэсліваюць існаванне канфлікту паміж такімі пісьменнікамі, як Купала, Колас, Гартны, Багдановіч з аднаго боку і кіраўнікамі газеты «Наша ніва» — з другога.

На жаль, ніводзін з даследчыкаў, якія падкрэсліваюць апазіцыйныя адносіны пісьменнікаў да афіцыйнай ідэалогіі «Нашай нівы», не прыводзіць выказванняў гэтых пісьменнікаў аб «Нашай ніве» і аб яе выдаўцах. У сувязі з гэтым прабелам хочам тут прывесці выказванні Гартнага, Багдановіча, Коласа. Гэта дазволіць чытачу адказаць на пытанне, якімі былі ў сапраўднасці адносіны беларускіх пісьменнікаў да «Нашай нівы».

Вядомы беларускі паэт, празаік і першы прэм'ер урада Савецкай Беларусі Цішка Гартны ў артыкуле «Два бакі беларускага руху», апублікаваным у 1923 годзе, назваў «Нашу ніву» «найбольш радыкальным перыёдыкам» сярод усіх легальных газет не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Рускай імперыі.

Сярод пісьменнікаў, якія не згаджаліся з афіцыйным курсам «Нашай нівы», Фіглоўская назвала, між іншым, дасканалага паэта М. Багдановіча. З гэтай прычыны варта прывесці выказванні гэтага паэта на тэму «Нашай нівы». Вось фрагменты артыкулаў Багдановіча: «В белорусском крае, истерзанном национальной борьбой, «Наша нива» неустанно напоминала о необходимости чтить права каждого народа, ценить всякую культуру и, закрепляя свои национальные устои, широко пользоваться преобретениями культуры как польской, так и великорусской и украинской. Это, а также и многое другое следует постоянно иметь в виду, учитывая значение скромной еженедельной белорусской газетки размером в один печатный лист. Вот уже девятый год работает «Наша нива» в этом направлении. Она подвергалась неоднократным конфискациям, редактор отсеживался в тюрьме, воспрещалось чтение её и для военных, и для духовенства, и для народных учителей, и для учеников учительских семинарий, и еще для ряда лиц.

Субсидируемая русская пресса травила её, утверждая, что она издаётся на польские деньги для ослабления в крае великорусских позиций и для подготовки почвы к ополячению его. В свою очередь, органы польского националистического национализма видят в ней точное средство для обрусения белорусов-католиков, созданное на деньги казны. Всё это не сломило энергии издателей «Нашей нивы» и не смогло задержать развития белорусского движения. В настоящее время «Наша нива» идёт в крестьянстве как ни один орган целого края. Со всех сторон всё льются писанные неискусной рукой крестьянина-белоруса кореспонденции, стихи, рассказы, статьи» (М. Богданович, Белорусское возрождение, 1914 (М. Багдановіч, Збор твораў, Мінск 1928, т. II, с. 138).

М. Багдановіч заняўся таксама роляй «Нашай нівы» ў працэсе збору беларускай інтэлігенцыі вакол народных ідэй і народных патрэб. Інтэлігенцыя гэта здавалася Багдановічу групай людзей, кроўна звязанай з лёсам народу. «Белорусской интелигенции, — пісаў Багдановіч, — не было и её необходимо было выработать. Питомником для неё и явилась «Наша нива». Лица, сплотившиеся вокруг «Нашей нивы», выросли в народе, от народа не оторвались, им известны народные нужды и народный язык, близка психика народа; они знают народ и народ знает их — знает и верит им» і далей: «Для многих тысяч людей она («Наша ніва» — А. Б.) явилась первой газетой, прочитанной ими, первым источником знания, не носившего казённой печати, изложенного простым и ясным языком. К белорусскому крестьянину, сжившемуся с мыслью, что он хам, а его «мова» — хамская, „Наша нива" печатно обратилась на этой «мове», вызывая в нём тем самым уважение к ней и к себе самому, пробуждая в нём чувство собственного достоинства. (М. Богданович. Новый период белорусской литературы (1912—1913) (М. Багдановіч. Збор твораў. Мінск 1928, т. II, с. 26).

У ЛАБАРАТОРЫЯХ ВУЧОНЫХ

УЧОРА, СЁННЯ І ЗАЎТРА

ІМШАРУ

Імшар... Багна, даступная калісьці чалавеку толькі ў надта сухое лета і ўвосень зіму. Таямнічая, але і прывабная. Калі старэйшыя жанчыны з навакольных вёсак выбіраліся туды ў лахіны ці журавіны, употайку шапталі замовы ад укусу вужа ды ад болю галавы. А як шчасліва перабрылі ўжо цераз прыбярэжную твань, якая магла засмактаць чалавека з галавой, перад вачыма кусціліся непраходныя зараслі лахінніку, усыпанага, што лісця не відаць, сінімі ягадамі велічынёй, бы слівы. Пудовы кош набіралі за якую гадзінудзве. Але за лахінамі людзі не гналіся — лічылі іх дурнымі ягадамі, наеўшыся якіх, розум можна было страціць. Разам з кашамі «дурной ягады» прыходзілі ў хаты бясконцыя жахлівыя апавяданні пра паласатых, пярэстых, а то і з рожкамі на галаве, тоўстых, бы рука людская, і доўгіх на сажань вужаках, што з шыпеннем слізгаліся каля босых ног і нават у кошыкі заглядалі. Ці то ад дурманячага паху багунніку, ці то для перасцярогі малалеткам, каб часам не ўздумалася ім паблукаць па багне, але аб Імшары, як гняздовішчы гадаўя ды нячыстай сілы, гаварылася ў колішнія часы вельмі часта. Толькі на зазімках, калі маразы нагола закуюць балота, часам звінела над Імшаром звонкая дзявочая песня. Тады дзяўчаты і маладзіцы бралі сакавітую, вялікую бы боб, пасаладжаную марозам журавіну. Але неўзабаве налятаў снежныя завірухі, і багно глухла зноў на цэлы год. Бо і чаго б пагнала ў тую крэкаць чалавека?!

І ўсё ж такі чалавек знайшоўся. Яго зацікавілі не легенды аб вужаках ды нячысціках, але багатыя залежы незвычайнага торфу ў Імшары, у якім знаходзіліся таксама пласты каштоўнага лекавага баравінавага торфу. Сёння ўжо пакойны, прафесар В. Славінскі з Медыцынскай Акадэміі ў Беластоку неўзабаве ўзначальвае калектыў вучоных, якія заняліся даследаваннем Імшару. Непраходная багна была ўздоўж і ўпапярок стаптаная вучонымі, перамерана і прасвідравана да самага дна. Падліскі і аналізы паказалі, што ў Імшары тояцца вялікія залежы сельскагаспадарчага, энергетычнага (на паліва) і баравінавага торфу.

Па ініцыятыве прафесара В. Славінскага даследаваннем лекавых уласцівасцей баравінавага торфу з Імшару заняўся Бальнеакліматычны інстытут у Познані. Пасля доўгіх і скрупулёзных аналізаў калектыў пазнанскіх вучоных на чале з праф. др М. Шмытуўнай адкрыў каштоўныя лекавыя якасці гэтага торфу, асабліва калі з яго нарыхтаваць спецыяльны экстракт. Ён дае добрыя вынікі ў лячэнні рэўматычных, скураных, траўматычных і гінекалагічных захворванняў, калі яго прымяняць да змазвання, кампрэсаў, абгортвання і ў рознага роду ваннах. У форме мікстуры, аблаткаў, капсул і г.д. гэты ж экстракт можа прымяняцца з добрымі вынікамі ў лячэнні хвароб стрававода.

Польшча багата баравінаю, а значная адлегласць Імшару ад шпіталяў і здраўніц пакуль што прымушае адмовіцца ад нарыхтоўкі лекавага баравінавага экстракту. Для гэтага патрэбны вялікія інвестыцыі. Але ў будучыні перад баравінаю з Імшару — вялікія перспектывы.

Сёння ж Імшар — гэта перш за ўсё вельмі добра працуючае прадпрыемства па нарыхтоўцы агародніннага торфу і розных яго сумесяў для вырошчвання агародніны ў шклярнях і парніках. Дзякуючы ініцыятыве і ўмеламу кіраўніцтву прадпрыемствам К. Майсенем, Р. Яжомбскім, Ч. Люлем і салідная працы рабочых, прадукцыя з Імшару завяявала не толькі ўсю Польшчу, але і шэраг краінаў Еўропы! Дапамог у гэтым імшарнаму торфу калектыў вучоных з Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў Варшаве на чале з доц. д-рам І. Р. Старкам. Гэта варшаўскія вучоныя па заказу прадпрыемства ў Імшары апрацавалі і выпрабавалі найбольш плённую рэцэптуру сумесяў «МІС — І», «МІС—2», «МІС—3».

Штогод з багны здабываюць 7,5 — 10 тысяч тон торфу, перасушваюць яго, апрацоўваюць (дробняць, ачышчаюць, перамолваюць, перасяваюць, даводзяць да патрэбнага стандарту) і пасля дакладнага перамяшання з адпаведнай порцыяй розных штучных угнаенняў пачкуюць у балоты (аднолькавай вагой і памерамі пачкі са штучнага рэчыва) ды адпраўляюць заказчыкам. Асноўныя яго пакупнікі — гэта агароднікі Узбярэжжа, Познані, Катавіц, Варшавы. Спрос на прадукцыю з Імшару такі вялікі, што прадпрыемства задавальняе яго толькі ў 50 працэнтах. І не дзіва. Агароднінны торф і яго сумесі — дасканалая глеба і ўгнаенне для вырошчвання ў шклярнях і парніках ранніх туркоў, салаты, радыскі, цыбулі, расады і кветак. Усё на ім расце, як на дражджах. Гэта стала вядома патрабавальным агароднікам Аўстрыі, Францыі, Італіі, Югаславіі. У гэтыя краіны Імшар штогод кіруе каля 25 тысяч балотаў сваёй прадукцыі. Надта ж выгадны эканамічна экспарт! І хоць прадпрыемства мае дасканалыя эканамічныя вынікі (у 1972 г. яно мела 4,5 мільёна чыстага даходу), у ім працуе ахвярны калектыў рабочых, які ў агульнадзяржаўную скарбонку «20 мільярдаў» унёс звыш аднаго мільёна злотых дадатковай прадукцыі, усё ж яго працаўнікі не толькі цешацца з сусветнай папулярнасці «міс» з Імшару, але і задумваюцца. Ці ёсць сэнс вывозіць з Беласточчыны такую каштоўную сельскагаспадарчую сыравіну ў Пазнанскае ваяводства ці нават за мяжу, каб адтуль прывозіць у гарады і мястэчкі нашага рэгіёну раннюю гародніну і кветкі? Ці не лепш было б пабудаваць паблізу Імшару вялікую шкляныевую гаспадарку і на месцы занядца агародніцтвам? Гэта таксама справа будучыні.

Цяпер у Імшары не знойдзеш лахін, бы сліва, і журавін, бы боб. Адвечную багну парэзалі і асушылі кар'еры. З кожным годам іх сетка ўсё гусцее і гусцее. Прыбывае дрыгвястай, залітай вадою, выэксплуатаванай паверхні.

— А што далей?

— Не. Імшар не спыніць свайго існавання! — усміхаецца дырэктар К. Майсеня. — Побач з Імшаром знаходзяцца велізарныя залежы торфу Рабінаўкі. Праўда, Імшару нам хопіць на 20 год, але мы ўжо загадзя заказалі дакументацыю на эксплуатацыю Рабінаўкі. На дрыгвястай паверхні выкарыстанага Імшару можна будзе заснаваць вырошчванне такой рэдкай цяпер і каштоўнай ягады, як журавіны. У навукова-доследных інстытутах даказана, што плантацыя журавін з аднаго квадратнага метра прыносіць 120 злотых чыстага даходу ў год, значыць, адзін гектар багны можа даць адзін мільён дзвесце тысяч злотых!

«Так, — думаецца мне, — гэта бадай трэцяя вялікая перспектыва Імшару».

* ✲ *

У суседніх вёсках мне казалі, што калі пачалася асушка Імшару, вужы і змеі цэлымі чарадамі перапаўзалі ў суседнія з ім зараслі і багны. З Імшару яны зусім выведліся.

А мне здалося, што яны толькі часова перасяліліся. Проста чакаюць, пакуль багну ўсцеле новы, засеяны рукой чалавека пышны дыван журавінніку. Тады вужы вернуцца на сваё ранейшае месца.

Вуж — мудрая істота. Нездарма ён знаходзіцца ў гербе Эскулапа — старажытнагрэчаскага бога медыцыны.

Мікалай Гайдук

Людзі салодкай фабрыкі

Гэтая салодкая фабрыка — фабрыка цукерак знаходзіцца ў Беластоку пры Прадукцыйнай вуліцы (Бацечкі). Мужчын у ёй амаль не відаць. З 96 працуючых — 86 асоб гэта жанчыны. Жанчыны ў белі. Быццам медсёстры. Яны і пры падрыхтоўцы салодкай масы, і пры машынах, якія з гэтай масы доўгімі вяроўкамі прадукуюць цукеркі. Яны і пры аўтаматах, якія крояць цукеркавыя вяроўкі і вяровачкі і ўмела загортваюць у прыгожыя паперкі, яны таксама загортваюць і складаюць у пачкі сваю прадукцыю, яны — тэхнічны кантроль і брыгадзіры. І кіраўнік цукеркавай фабрыкі — жанчына. Завуць яе Нэля Раманоўская. Чалавек гэты ветлівы, знае сваю справу і абавязкі і карыстаецца пашанай сярод рабочых. На гэтай пасадзе працуе нядоўга, але працуе значна лепш ад свайго папярэдніка.

План фабрыкі на 1973 год акрэсліваецца сумай 28 мільёнаў зл. Фабрыка штодзённа прадукуе 5 тон цукерак. На працягу года дае яна 1 100 тон цукерак. Прадукцыю можна будзе значна павялічыць. Усё залежыць ад людзей, а яны працавітыя.

Моладзь аб'яднана ў гуртку Саюза сацыялістычнай моладзі (ЗМС). Гурток узначальвае Ян Рагазінскі, які на фабрыцы працуе галоўным механікам. ЗМС-оўцы два разы працавалі ў нядзелі па 16 гадзін пры прадукцыі ландрынак. У мінулым годзе дапамагалі будаваць дом адпачынку над возерам Дрэнства ў мясцовасці Рыбчызна. Будавалі і малявалі самі кампінговыя домікі. Іх там 20 штук. ЗМС супольна з радай прафсаюзаў прадпрыемства ў мінулым і гэтым годзе арганізавалі навагоднюю ёлку для дзяцей працаўнікоў сваёй фабрыкі.



Кіраўнік фабрыкі Нэля Раманоўская (злева) ў размове з работніцай, якая абслугоўвае аўтамат, загортваючы цукеркі ў паперкі. На працягу дня працы загортвае ён у сярэднім больш 400 кг цукерак.

Добрымі і актыўнымі ЗМС-оўцамі з'яўляюцца Аліцыя Гроць і Галіна Філіпава. Яны таксама добра працуюць. Гэта сцвярджае кіраўнік фабрыкі Нэля Раманоўская.


Да перадавых і шматгадовых работнікаў фабрыкі залічаюцца Здзіслава Пляўг і Браніслава Чабан, якія беспасрэдна працуюць у прадукцыі цукерак. Іх салідпасць можа быць прыкладам для іншых.

У аддзеле завівання цукерак рэкорды б'е Ядвіга Шчавінская. Яна ў дзень уручную завівае да 60 кг цукерак, гэта значыць, у сярэднім 5 700 штук.

Ніна Гадлеўская — адна з найстарэйшых работніц фабрыкі. Расказвае яна аб тым, як працавалі тут калісьці. Не была механізавана фабрыка. Цукеркі-карамелькі, варылі на звычайнай пліце і ўручную ўсё выконвалі. Цяпер яна працуе брыгадзірам. Была членам прафсаюзнай рады прадпрыемства. Цяпер працуе грамадскім інспектарам працы на сваёй фабрыцы. Нядаўна атрымала яна ў блоку прыгожую кватэру на вул. Бэма, якая складаецца з чатырох пакояў і кухні. Двое яе дзяцей ходзяць у пачатковую школу на Сухой вуліцы. Муж яе па спецыяльнасці электрамеханік. Часам наведвае яна з дзецьмі і мужам сваю родную вёску Мялешкі, дзе жыве яе родны брат.

Міхась Хмялеўскі
Фота Янкі Цялушэцкага

Ніна Гадлеўская (пасярэдзіне) пры машыне, якая прадукуе цукеркі.



Ручное пакаванне цукерак і накладванне іх у каробкі.

Якая пшаніца найлепшая?

Той, хто займаецца пячэннем хлеба ці булак, ведае, што не з кожнага зерня будзе добрая мука. Але якое яно гэтае добрае зерне? Якую пшаніцу і дзе трэба сеяць, каб мець не толькі колькасныя эфекты, але і якасныя?

Справамі гэтымі займаецца калектыў вучоных з Інстытута тэхналогіі харчавання Сельскагаспадарчай акадэміі ў Варшаве. Вось што сказаў аб працы вучоных дырэктар гэтага Інстытута дацэнт доктар габілітаваны Тадэуш Якубчык:

— У Польшчы зараз вырошчваецца каля 30 сартоў пшаніцы. У асноўным гэта так званыя сарты інтэнсіўныя, якія даюць высокія плёны з гектара. Аднак не заўсёды колькасць ідзе ў пары з якасцю. Найбольш важным для чалавека кампанентам зерня з'яўляецца бялок. Тыя сарты пшаніцы, якія маюць менш чым 10 прац. бялка, з пункту гледжання харчавання з'яўляюцца менш вартаснымі. Доследы вучоных паказваюць, што некаторыя сарты маюць толькі невялікія колькасці бялка. Па той іменна прычыне павінна быць, напрыклад, выведзена з вырошчвання пшаніца «данькоўская бяла», якая хаця і дае высокія плёны, але мае толькі 8 прац. бялка.

Вучоныя з Варшавы вядуць доследы над 8 сартамі пшаніцы: «дана», «экавова», «эрос», «грана», «геленка», «каўказ», «люна» і «міронаўская». Гэтыя сарты як краёвыя, так і імпартаваныя з ГДР і СССР.

Доследамі ахоплены чатыры ваяводствы: Люблінскае, Апольскае Быдгаскае і Варшаўскае. Вырошчванне пшаніцы адбываецца не толькі на розных глебах і ў розных кліматычных умовах, але і даюцца розныя дозы ўгнаенняў, каб вызначыць аптымальную колькасць угнаенняў для кожнага сорту ў адпаведных умовах.

Доследы праводзяцца толькі год часу, і таму нельга рабіць канчатковых вывадаў. Аднак ужо цяпер можна сцвердзіць, што найлепш аплочваецца вырошчваць пшаніцу «каўказ», «люну», «міронаўскую», яна дае плёны 50—60 цэнтнераў з гектара і мае аж 16—17 прац. бялка. Пшаніца «эрос» таксама ўраджайная, але мае толькі 11—12 прац. бялка. (ак)

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА



Перад вучонымі Беларусі ў гэтай пяцігодцы (1971—1975 г.г.) пастаўлены вялікія і адказныя задачы. Акадэмія навук БССР, вышэйшыя навучальныя ўстановы, навукова-даследчыя, праектна-канструктарскія і тэхналагічныя арганізацыі канцэнтруюць свае намаганні на расшырэнні актуальных праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу, і ў першую чаргу ў галіне матэматыкі, кібернетыкі, вылічальнай тэхнікі, фізікі, машынабудавання і прыборабудавання, энергетыкі, хіміі, сельскай гаспадаркі і меліярацыі зямлі.

Над вырашэннем пастаўленых задач працуе вялікі калектыў вучоных Беларусі. Цяпер у рэспубліцы налічваецца 178 навуковых устаноў, у тым ліку 28 вышэйшых навучальных устаноў. У гэтых установах працуе каля 24 тысяч навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў, сярод іх больш 6 тысяч дактароў і кандыдатаў навук. Самым буйным навуковым цэнтрам рэспублікі з'яўляецца Акадэмія навук БССР. У пяці яе аддзяленнях (грамадскіх, фізіка-матэматычных, фізіка-тэхнічных, біялагічных, хімічных і геалагічных навук) аб'яднаны 32 навукова-даследчыя ўстановы.

У Інстытуце фізікі праводзяцца глыбокія тэарэтычныя і эксперыментальныя доследы ў галіне квантавай электронікі, атамнай і малекулярнай спектраскапіі, люмінісцэнцыі і фотахіміі, оптыкі рассейваючых асяроддзяў, спектраскапіі, нізкатэмпературнай плазмы, оптыкі і акустыкі крышталаў. У гэтым інстытуце была прадказана, а пасля адкрыта новая фізічная з'ява — здольнасць раствораў складаных арганічных спалучэнняў да генерацыі святу. На гэтай аснове былі створаны новы клас лазераў, дазваляючы атрымаць праменяванне ў шырокім дыяпазоне даўжыні хваляў з плаўнай перастройкай частаты. Гэтыя лазеры ўжо знаходзяць прымяненне як у навуковых доследах, так і на практыцы.

Гэта праца ўдастоена высокай узнагароды — Дзяржаўнай прэміі СССР 1972 года.

У Інстытуце матэматыкі побач з глыбокімі тэарэтычнымі доследамі па дыферэнцыяльных ураўненнях, алгебры і тэорыі лічбаў, выкананы вялікія па аб'ёму і значэнню працы па матэматычнаму забеспячэнню найбольш распаўсюджаных у СССР ЭВМ серыі «Мінск». Істотны ўклад унёс гэты інстытут у распрацоўку тэорыі аўтаматычнай рэгуліроўкі. Развіты новы падыход да тэорыі ўстойлівасці руху, распрацаваны новыя эфектыўныя метады стабілізацыі рэгулюемых сістэм. Гэта праца таксама ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР 1972 года.

Інстытут тэхнічнай кібернетыкі стварае аўтаматызаваную сістэму праектавання і тэхнічнай падрыхтоўкі вытворчасці ў машынабудаванні.

У фізіка-тэхнічным інстытуце атрыманы сур'ёзныя вынікі ва ўстанаўленні агульных заканамернасцей будовы металаў і сплаваў і стварэнні новых працэсаў апрацоўкі матэрыялаў. У інстытуце зроблена навуковае адкрыццё ультра-гукавога эфекту, сутнасць якога заключаецца ў павелічэнні хуткасці руху і высаты пад'ёма вадкасцей у капілярах пад уплывам ультрагука, у дзесяткі разоў перавышаючым дзеянне радыяцыйнага ціску. Гэта адкрыццё мае вялікае значэнне для многіх галін навукі і тэхнікі.


Атрымалі шырокае прызнанне і ўкараненне ў вытворчасць даследаванні вучоных Акадэміі навук БССР па механіцы палімераў і распрацоўцы інжынерных метадаў разліку металапалімерных канструкцый і дэталяў машын.

Геолагі, геафізікі і геахімікі Беларусі правялі ўсебаковыя даследаванні нетраў рэспублікі і даказалі іх перспектыўнасць на розныя віды карысных выкапняў. У Беларусі адкрыта некалькі месцанараджэнняў нафты і створана новая галіна прамысловасці — нафтаздабываючая. Беларуская нафта па нафтаправоду «Дружба» пацякла ў Польшчу, Чэхаславакію, ГДР і Венгрыю. Адкрыты буйныя месцанараджэнні калійных солей (Старобінскае і Петрыкаўская). На базе Старобінскага месцанараджэння працуюць тры камбінаты, даючы прыкладна 50 працэнтаў усіх калійных угнаенняў, якія прадукуюцца ў СССР. Адкрыты паклады жалезных руд, бурага вугалю, гаручых сланцаў і інш.

У палепшэнне спосабаў перапрацоўкі калійных руд унеслі сур'ёзны ўклад вучоныя Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР. Імі распрацаваны і сумесна з работнікамі аб'яднання «Беларускалій» укаранёны ў прамысловым маштабе новыя рэагенты для флатацыі калійных руд. Эканамічны эфект ад укаранення гэтых прац склаў каля 4,5 млн. рублёў у разліку на год. Хімікі рэспублікі вядуць таксама шырокія доследы ў галіне каталізу, нафтахіміі.

Сярод важнейшых навуковых праблем Беларусі асобае месца займае праблема комплекснага асваення Палескай нізіны. Палеская нізіна ахоплівае 13 млн. гектараў. У яе прыродным ландшафце пераважаюць забалочаныя лугавыя ці лясныя раўніны, тарфяныя масівы, развяваемыя пяскі і паволі цякучыя рэкі. Пастаўлена задача карэннага пераўтварэння прыродных умоў гэтага краю з мэтай далейшага інтэнсіўнага развіцця яго вытворчых сіл. Толькі ў беларускім Палессі намечана меліяраваць каля 3 млн. га забалочаных зямель і зямель з завялікай вільготнасцю, на плошчы ў 1,6 млн. га пабудаваць сучасныя сістэмы навадненне і больш 400 буйных і дробных вадасховішчаў, стварыць 70 саўхозаў. Навуковае і практычнае вырашэнне праблемы выклікала неабходнасць уключэння ў работу звыш 30 навукова-даследчых інстытутаў, вузаў і праектных арганізацый рэспублікі. Каардынацыя навуковых доследаў на Палессі ажыццяўляецца Акадэміяй навук БССР.

А. Махнач,
акадэмік Акадэміі навук БССР



Будынак Інстытута тэхнічнай кібернетыкі АН БССР.



СВЕТЛЫЯ КОЛЕРЫ

Вясною, бадай як у ніводную пару года, хацелася б купіць, або пашыць сабе нешта новае: паліто, касцюм, сукенку. Мода гэтага года абапіраецца на светлых, далікатных колерах. Яна лёгкая, простая і сапраўды жаночая. На шчасце, пасля доўгага перыяду, калі практавана ўсё з думкай аб шчуплай дзявочай фігуры, дыктатары моды прыпомнілі сабе аб жанчыне дарослай, якая хацела б і павінна апранацца крыху інакш, чым яе дачка або малодшая сястра.

На вясну пры нагодзе варта напомніць, што элегантная жанчына з прапанаваных модных мадэляў выбірае заўсёды тое, што падкрэслівае яе прыгажосць, а не наследуе слепа моду з журналаў. Жанчына, якая бескрытычна шые сабе сукенку без «прымеркі» яе ў думках да сваёй фігуры, часта выглядае смешна.

Мода гэтага года спакойная. Агульная лінія засталася ў асноўным без змен: верх дапасаваны, а ніз расшыраны. Вопратка шыецца лёгкая, мяккая прылягаючая да цела. Мода «максі» на лета не прынялася, і ўсе сукенкі будзем насіць найчасцей вышэй калена.

Веснавыя паліто маюць амаль класічны фасон. У касцюмах пераважаюць доўгія, даволі вузкія жакеты, да якіх носім плісаваную спаднічку. Да гэтага ўбору варта было б пашыць спартыўную блузку з гальштукам. Нельга аднак пры гэтым забывацца, што ў доўгім жакеце з плісаванай, шырокай спадніцай добра будуць выглядаць толькі жанчыны высокія і шчуплыя.

Штаны надалей вельмі модныя (нават на вечар), і аб гэтым мы будзем яшчэ пісаць асобна.

Касцюмы і паліто шыем у гэтым сезоне з аднакаляровай шэрсці, з розных клетак. Вельмі модныя колеры: белы, крэмавы, салатавы, ружовы, блакітны. З цёмных колераў далей вельмі модны колер цёмнасіні, часта спалучаны з белым, а таксама фіялетавы розных адценняў і ў спалучэнні з жоўтым.

Сяброўка





Апоўначы Альтэнкірх спыніўся і зірнуў на гадзіннік.

— Калі ўсё ідзе добра, — сказаў ён, — у гэты момант самалёты скідаюць груз.

Ён не памыляўся. Якраз у гэты самы час за дваццаць кіламетраў на поўнач ад іх два лётчыкі на «Хейнкелях-III» шукалі вачыма сігнальныя агні і раптам убачылі, як адзін за другім успыхнулі чатыры яркія вогнішчы, утварыўшы не зусім правільны чатырохвугольнік. Лётчыкі скіравалі самалёты ў той бок і скінулі на парашутах груз — чорныя сухары, мясныя кансервы, вітамін «С» у таблетках, масла, сыр, абутак, цыгарэты, патроны для аўтаматаў і пісталетаў, ручныя гранаты, узрыўчатку. Людзі, што запалілі вогнішча, дзелавіта адчэплівалі пакі і скрылі ад парашутаў.

А за дваццаць кіламетраў на поўдзень ад таго месца пяць чалавек працягвалі свой цяжкі шлях праз лес. Вайтхазе і Альтэнкірх падбадзёрвалі астатніх, заклікаючы іх вытрымаць, таму што да світання было ўжо недалёка і нельга было траціць ні мінуты. Перад чыгуначным насыпам яны пастаялі некалькі мінут, прыслухоўваючыся, потым шоргаючы ботамі па гравію, падняліся і перабеглі палатно.

Той ноччу большай часткай маўчалі. Кожны стараўся вызначыць сваю ролю ў тым, што адбываецца, угадаць, што яго чакае ў будучыні.

Будэр у думках разблытваў клубок выпадковасцей актаў самааховы і адважных учынкаў, што прынеслі яму славу надзейнага салдата, дзякуючы якой яго цяпер паслалі ў гэтыя лясы, выбрацца адкуль не такая лёгкая справа.

Альтэнкірх маляваў сабе імклівы прарыў групы Грэльхамера на захад і ў думках размеркаваў ордэны: Грэльхамеру «Дубовы ліст», сабе — «Рыцарскі крыж», Будэру — «Нямецкі крыж у золаце».

Вайтхазе абдумваў, што трэба будзе рабіць заўтра і паслязаўтра, перабіраў у думках усе нечаканасці, якія могуць яго падпільноўваць, але не допускаў думкі, каб што-небудзь магло парушыць яго планы. Адно трывожыла — занадта ўжо гладка ўсё пакуль што ідзе.

Цяжкія думы апанавалі старшага лейтэнанта Чырвонай Арміі Сяргея Мартынава. Ноччу ён меў дзесяткі зручных выпадкаў, каб збегчы ад гэтых фашыстаў. Большай часткай яны трымалі яго ў сярэдзіне. Але, калі пераходзілі ручай, калі перабягалі цераз чыгунку, і ў шмат якіх іншых выпадках ён на нейкі момант аказаўся ззаду, альбо крыху з боку ад іх. У тыя імгненні ён мог знікнуць у цемры і іх кулі яго б не знайшлі. Нарэшце, і за гэтыя дні ў яго было безліч магчымасцей, ён мог усіх да аднаго перастраляць гэтых фашыстаў, перш чым каму з іх удалося б націснуць на спуст.

«Забі іх!» — час ад часу гаварыў ён сабе. Але кожны раз яго спыняла думка пра тое, як мала ён яшчэ ведае. Яму было вядома, што група Грэльхамера ў цяперашні момант налічвае 1200 баяздольных салдат і афіцэраў, аднак дзе яны хаваюцца, дакладна ён не ведаў. Як ён разумеў, штаб Грэльхамера знаходзіцца на адлегласці аднаго начнога пераходу ад іхняга першага лагера. Але якая з таго карысць? Дакладных дадзеных ён не мае. Гэтай ноччу, відаць, самалёты скінулі прадукты і боепрыпасы, але дзе, у якім месцы? Безумоўна, савецкія людзі заўважылі варожыя самалёты і зразумелі, што нехта выклікаў іх у гэтыя лясы. Значыць, тое, пра што ён пакуль што даведаўся, для іх і без яго не сакрэт.

Але калі цябе схопяць, табе канец! Гэта трывожная думка настойліва свідравала мозг Мартынава, і першы час яму каштавала вялікіх намаганняў адагнаць яе, каб яна не замінала здзейсненню яго плана. Аднак, чым больш часу ён знаходзіўся ў групе Альтэнкірха, тым радзей яна даймала яго. Усё прадугледзець нельга. Без рызыкі выйсця з гэтай сітуацыі не знойдзеш. Мартынаў пачаў спакойна разважаць пра ўсё, што адбылося, і стараўся прадбачыць, што можа здарыцца ў будучым. Перабіраў па костачках Альтэнкірха і Будэра, Франке і Вайтхазе. Асабліва многа ўвагі ўдзяліў апошнім. З тае пары, як да іх далучыўся Вайтхазе, Мартынаў амаль нічога новага не дазнаўся. Раней Альтэнкірх быў з ім больш шчыры, аднойчы нават адпусціў яго аднаго блукаць па наваколлі. Амаль усё, што ведаў Альтэнкірх, ведаў і Мартынаў. Аднак з таго часу, як да іх з'явіўся гэты обер-лейтэнант, Мартынава амаль што ізалявалі — утойвалі змест радыёграм і ні на момант не спускалі з яго вачэй. Як яны яшчэ зброю пры ім пакінулі! Думка гэ-

ТРЫБУНА чытачоў

КРАМА-ЦЯМНІЦА

У Кнышэвічах Сакольскага павету крама ў прыватным будынку. Калі праводзілася электрыфікацыя Кнышэвіч, гэты дом быў апушчаны. Уласнік яго жыве ў Валілах. І дом не быў электрыфікаваны. Потым ГС у Крынках наняў гэты дом пад краму. І цяпер крама без электрычнага асвятлення. ГС не праводзіць электрычнасці, спасылаючыся на тое, што будынак прыватны. А ўласнік будынка ж у Валілах, і яму асветленая крама ў Кнышэвічах непатрэбная.

Найгорш прадаўшчыцы. Восенню і зімой мусіць лямпу паліць цэлы дзень. Бо яна скупляе яйкі і вымушана прасвятляць іх пад закопчанай лямпай. Не раз свежыя яйкі звяртае як папсутыя. Узнікае калатня і злосць на прадаўшчыцу, што кепска яйкі прымае. А яна пры закопчанай лямпе прасвятліць іх не можа.

А. С.

ПАРНАСік
ЧЫТАЛЬНІЦКАЯ ЛІТСУПОЛКА НА НЕГАРАНТАВАНЫХ ПАЯХ

ДА ДЗЕДА МАРОЗА

Студзень ужо ўцёк адсюль,
Меў студзіць, а не марозіў.
Дзед сварыўся з бабаю дасюль,
Санкі выцягнуць, ці возік?

Ну, і вырашыў на канец
Паслаць пісьмо да Мароза,
Запытаць яго: цяпер
Санкамі ездзіць, ці возам?

Дзед Мароз, ты не жартуй з нас,
Цяпер люты, а не май.
Мо марозіць ўжо не хочаш,
Дык зусім ад нас ўцякай.

Уночы снег дробненька сееш,
Лёдзік крышачку скуеш,
А дзе мяцеліцы, завеі?
Лютым ты ж сябе завеш!

Вада хлюпае, балота,
Льюцца ручаі са стрэх.
Спутала цябе лянота,
А сядзець бясчынна грэх.

Можа, час ты дрэнна мерыш,
Маеш дрэнны каляндар?
Што цяпер зіма — не верыш,
Дык людзей ты папытай.

Людзі зараз будуць сеяць,
Ў агародах прыбіраць,
Тады ветры, снег, завеі,
Будзеш ты нам пасылаць.

Юрка Панасюк, Бельск

тая здзіўляла яго не менш, чым тая абыякавасць, з якой ставіўся да яго Вайтхазе.

Калі, нарэшце, дабрылі ў вызначаны ім сектар лесу, усе ў знямозе павалілііся на зямлю. Ледзь хапіла сіл скінуць з плячэй рамяні ношаў. Яны дабраліся да лесу якраз у пару, бо макаўкі дрэў запунсавелі ўжо ад першых промняў сонца, і птушкі на ўсе лады распачалі свой ранішні канцэрт. Вайтхазе падрадзіўся ўзяць на сябе першую, самую цяжкую, вахту. Калі ўсе паснулі, ён пачаў уважліва разглядаць іхнія твары — дабрадушны, але цяпер крыху апатычны твар Будэра, энергічны твар Альтэнкірха з нервовымі складкамі ля ноздраў, рашучыя рысы Мартынава. Аднак даўжэй за ўсё позірк Вайтхазе затрымаўся на аблічы Франке.

«Кепска ж выглядае юнак, — падумаў ён. — Аднак, калі я ў першы раз сустрэў яго, ён быў амаль такі ж качачавы, напэўна, ад роду такі. Але ясна відаць, што ён зусім змардаваны. Паўгода назад яму прастрэлілі лёгкія і як толькі паднялся, яго зноў паслалі на фронт. Калі знайду для гэтай работы каго іншага, адразу ж пашлю яго назад. Нельга ж, на самай справе, ганяць яго ледзь не кожную ноч на такія адлегласці. Праўда, не так што і проста знайсці яму замену. Франке выносліве, і для справы, якая патрабуе вытрымкі, мужнасці і розуму, ён чалавек незаменны».

(Працяг будзе)

ДАРОГА Ў СПІЧКІ

Я хачу вам апісаць
Спічкоўскія дарогі,
Імі нельга праязджаць —
Конь паломіць ногі.

На нашай дарозе
Ёсць многа балота,
Ходзім у трывозе,
Ісці неахвота.

Да Парцава ў школу
Ходзіць вучняў многа,
Ідуць яны і стогнуць:
— Ці ж гэта дарога?!

Выглядаюць брудна,
Як пройдуць праз поле.
Як хадзіць тут трудна,
Як вучыцца ў школе?

А у гміне ў Орлі
Усе сядзяць, віно п'юць.
На нашу дарогу
Вокам не зірнуць.

Пуста ў склепе нашым,
Няма тут нічога,
Няма хлеба, кашы,
Віноўна дарога.

Бяздольны



Сардэчныя тайны

Дарагое «Сэрцайка»!

Мне споўнілася 20 год. Была я замужам, аднак разам жылі мы вельмі мала, толькі два месяцы. Пасля я пакінула мужа і пайшла жыць да бацькоў. Праз год муж падаў на развод. Адбылася судовая справа, і развод Вася атрымаў. І вось цяпер я бачу, як дрэнна я зрабіла, адыходзячы ад яго, але тады я не здавала сабе з гэтага справы. Нявыгадна мне жыць і ў бацькоў, бо разам з імі таксама жыве мая замужняя сястра з мужам. Гаспадарка ў нас даволі добрая, і яны ўжо пераймалі яе ад старых бацькоў. Цяпер не ведаю, што рабіць, мо выйсці мне замуж за іншага хлопца?.. Бо, хоць я і разведзеная, але сватаўся да мяне хлопец з суседняй вёскі. Аднак я не згадзілася за яго выйсці. Праўду кажучы, не маю я ні адвагі, ні ахвоты выходзіць замуж за яго, ані за каго іншага, бо я кахаю Васю. А што так сталася з намі, гэта толькі мая віна. Але я не бачу цяпер, калі ўжо позна. Не разумела я сямейнага жыцця. Васевы заўвагі, якія былі слушныя, я тады ўважала за дрэнныя. Павучыць мяне не было каму. Вася — хлапец разумны, вясёлы, спрытны да ўсялякай работы. Не магу сабе дараваць, што я сама сабе нарабіла. А мо пайсці да Васі, перапрасіць яго і бацькоў? Можа, згадзіцца б мяне ізноў прыняць. Парай, «Сэрцайка»!

Зіна з Бельшчыны

Зіна! Як кажуць у народзе, «агледзеўся Гаўрыла, як паўклуні згарэла». Мінуў жа цэлы год да таго часу, калі муж падаў на развод. Чаму ж ты раней не агледзелася, а толькі пасля разводу ўбачыла, што ён такі добры хлопец. У жыцці ўсяляк бывае, як кажуць, «няма тае хаткі, каб не было звадкі», але нельга ж пры першых нейкіх дробных непаразуменнях уцякаць ад мужа, бо не заўсёды муж зараз жа прыбяжыць, каб перапрасіць і забяры назад. Твой паступак быў неразважлівы і сведчыць аб тым, што была ты маладая і зусім не падрыхтаваная да замужаства, што не здавала сабе справы з яго важнасці і паступіла лёгкадумна. Добра, што зразумела сваю памылку, толькі хоць не зрабі яшчэ другой, выходзячы замуж абы за каго. Калі Васю кахаеш, дык шукай спосабу, каб з ім спаткацца, ды паказаць сябе як найлепш. Ён жа кахаў цябе, калі ажаніўся. Можа, калі ўбачыць цябе як разважлівую, талковую дзяўчыну, дык згодзіцца пачаць усё нанава.

«Сэрцайка»

ПАДРЫХТОЎКА

Нядаўна ў Дубічах Царкоўных пачалася падрыхтоўка дзяцей, якія восенню гэтага года пойдуць у першы клас. Гэтыя дзеці два разы ў тыдзень ходзяць у школу, дзе знаёмяцца са школьнымі правіламі і паводзінамі. Урокі адбываюцца па тры гадзіны і выклікаюць у дзяцей задавальненне. Напэўна яны дадуць карысць малышам і лягчэй ім будзе ў першым класе прысвойваць школьныя веды.

Вучаць настаўніцы Марыя Марчук і Надзея Несцярук.

М. Панфілюк

ЯК НА ІНШЫМ СВЕЦЕ

Бакавое — гэта ляўкоўскія каленіі ў Гайнаўскім павеце. У 1971 годзе завітаў сюды інжынер, які зрабіў план электрыфікацыі хутароў. І вось у канцы 1972 года засвяціліся ў хатах электрычныя лямпачкі. Жыхары Бакавога адчулі сябе, як на іншым свеце. Забубнілі радыёпрыёмнікі і тэлевізары. Жыхары пакупілі электраухавікі, млынкі, сячкарні, крайзэгі, а бабам, каб лягчэй мыць бялізну — пральні.

Яшчэ хочуць бакаўцы, каб да іх завітаў нейкі дарожны інжынер і зрабіў план на наладку дарогі Ляшукі — Бакавое — Ляўкова, каб не губіць ботаў і не гразнуць вазамі ў муле.

Аляксандр Кузьма, Бяндзюга

ПАПУЛЯРНА-НАВУКОВАЯ СЕСІЯ

21.II.1973 г. у беларускім ліцэі ў Бельску адбылася папулярна-навуковая сесія, прысвечаная 500-годдзю з дня нараджэння Мікалая Каперніка.

У спартыўнай зале сабралася ўся моладзь школы. На сесію прыйшлі таксама прадстаўнікі іншых школ. З дакладамі выступілі вучні: Г. Крукоўская, Я. Прызовіч, Л. Троц і Л. Гулько. Яны прадставілі эпоху, у якой жыў М. Капернік, яго жыццёвы шлях, значэнне працы польскага астранома і ўплыў яго тэорыі на далейшае развіццё астраноміі.

Дзякуючы сесіі, моладзь нашага ліцэя дакладней пазнаёмілася з тэорыяй Каперніка. А можа некаторыя зацікавяцца сучаснай астраноміяй і, як вялікі польскі вучоны, звяжуць свой лёс з гэтай навукай?

Кастусь

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Муж выгнаў жонку з кватэры і падаў на яе ў суд. Ці можа яна дамагацца, каб вярнуцца ў кватэру, у якой яна дагэтуль займала адзін асобны пакой? Ці можа дамагацца падзелу мэблі і іншых рэчаў хатняга ўжытку?

АДКАЗ: Жонка можа дабівацца праз суд магчымасці вярнуцца ў кватэру і забароны перашкаджання ёй у далейшым пражыванні ў гэтай кватэры. Паколькі муж падаў на развод, жонка можа дамагацца сваіх правоў перад судом, які разглядае справу аб разводзе. Яна павінна падаць заяву да справы аб разводзе, і суд вырашыць справу асобным распараджэннем. Такім жа спосабам можа быць вырашана справа прадметаў хатняга ўжытку. Пасля разводу праблемы гэтыя вырашаюцца асобнай справай аб падзеле супольнай маёмасці. Справа кватэры вырашаецца пры гэтым у залежнасці ад таго, ці з'яўляецца яна ўласнасцю мужа і жонкі, ці аднаго з іх, ці кватэра кааператыўная, ці належыць дзяржаве.

Пазнаёмімся

Я жыву ў Аўгустове, а вучуся ў II класе беларускага ліцэя ў Бельску. Я вельмі хацела б перапісвацца з вучнямі іншых школ, асабліва тымі, якія вывучаюць беларускую мову. Цікава, як адбываюцца ў іх заняткі, якія ёсць турткі і арганізацыі, чым жывуць у іх займаюцца. Апрача гэтага, хацела б падыскутаваць з сябрамі аб фільме, спорце і музыцы. Я ўжо даўно гэтым цікаўлюся і збіраю здымкі слаўных артыстаў і спартсменаў. Збіраю таксама звычайныя паштоўкі.

Калі ў каго ёсць падобныя зацікаўленні, прашу напісаць да мяне на адрас:
Halina Wieremiejuk, w. i p-ta Augustowo-30, pow. Bielsk-Podl.



Наша пошта

М. Красоўскі, Малынка. Ваш развітальны ліст, які мы днямі атрымалі, вельмі нас занепакоіў. Мы тых намераў, якія вы нам прыпісваеце, ніколі не мелі. Цэнім вас і хочам не толькі сябраваць з вамі, але і надалей друкаваць вас (абяцаем быць ліберальнымі адносна моцных слоў). Не капайцеся ў нашых «намёках». Мы вас любім.

Н. Кучынская, Бельск. «Муж-п'яніца» спадабаўся. Надрукуем.

Ян Анацік, Бельск. «А час усё ляціць» надрукуем.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Zwariowałeś Toni" (czeski), 20—21. „Zwariowana noc" (polski), 22—23. „Tam, gdzie rośnie zielony bór" (jugosł.), 24—25.

Нараўка
„Ballada o Cable'u Hugue'u" (USA), „Zdobywcy nieba" (radz.), 21—25.

Нарва
„Trup w każdej szafie" (czeski), „Bajka o Mrozie Czarodzieju" (radz.), 21—25.

Чыжы
„12 krzeseł" (radz.), „Perła w koronie" (polski), 21—25.

Дубічы Царкоўныя
„Pamiętnik szalonej gospodyni" (USA), „Gitwa o Kozi Dwór" (polski), 21—25.

Арэшкава
„Agent Nr 1" (polski), „Jaskółki" Węgierski), 24—25.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Życie rodzinne" (polski), „Sprawa trzynastu" (radz.), 21—25.

Орля
„Polonez Ogińskiego" (polski), „Ucieczka w milczenie" (NRD), 21—25.

Райск
„Przez pustynię" (polski), „Szerokiej drogi kochanie" (polski) 21—25.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Крынкі
„Tajemniczy mnich" (radz.), 20—21. „Dwaj panowie bez parasola" (rumuński) 22—23. „150 na godzinę" (polski), 24—25.

Шудзялава
„Film o miłości" (węgierski), „Małżonkowie roku II-go" (rum.), 21—25.

Янаў
„Księżniczka Czardasza" (węgierski), 21—25.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Dziewczyna z walizką" (włoski), 20—21. „Lekcja odwagi" (czeski) 22—23. „Ktoś za drzwiami" (franc.), 24—25.

Мельнік
„Jutro na orbitę" (radz.), 20—21. „Sokoły" (węgierski), 22—23. „Pilot helikoptera" (rumuński), 24—25.

Мілейчыцы
„Labirynt miłości" (radz.), 20—21. „Straszliwe skutki awarii telewizora" (czeski), 22—23. „Woda życia" (radz.), 24—25.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

„Sąsiedzi" (polski), „Popierajcie swego szeryfa" (USA), 21—25.

Новы Двор
„Doczekać zmroku" (USA), „Ulica graniczna" (polski), 21—25.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

Adres redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1, Telefony: red. naczelny 2-10-33, centrala 2-32-41 do 45. Warunki prenumeraty: miesięcznie — 2,40 zł, kwartalnie — 7,20 zł, półrocznie — 14,40 zł, rocznie — 28,80 zł. Prenumeratę przyjmują wszystkie placówki pocztowe i listonosze. Wpłaty na prenumeratę indywidualną należy dokonywać na konto PUPiK „Ruch" Nr 102-7-161 NBP Białystok I Oddział Miejski. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Zamówienia ze zleceniem wysyłki za granicę przyjmuje — Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23. Nr konta PKO 1-6-100024. Zamówienia z krajów europejskich jak i zamorskich należy kierować pod adresem Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch", Warszawa, ul. Wronia 23.

BZGraf. Nakład 7.760 K-1

ТРЭНІРОЎКА

Таварыш пры сустрэчы
Заўжды мяне даймаў:
— Ты маеш рост і плечы,
А мускулаў няма.

— Канторская работа,
Сам знаеш —
Не каваль...
— Калі б была ахвота, —
Былі б цвярдзей за сталь.

Ты менш ляжы ў пасцелі,
Раней заўжды ўставай,
Купі сабе гантэлі
І ранкам падымай.

— Куплю, куплю, вядома,
З табою ж падбяру,
Адразу, як з раддома
Я жонку забяру...

Прывёз дамоў малога.
Сыночак не маўчыць,
Пабудзіць нежывога
І ўранку, і ўначы.

Турбот па горла ў жонкі:
Да самага цямна
Парадкуе пялёнкі —
І ўсё адна, адна...

І я нагрузкі маю,
Хоць часам ім не рад, —
Каляску ўсё штурхаю
То ўперад,
То назад.

Зажыў нарэшце лепей,
Хоць страчаны спакой,
А мускулы
акрэплі
І пасвятлеў пакой.

Не адчуваю стомы
Ранейшай у руках,
Калі да самай столі
Я гушкаю сынка.

Мікола Чарняўскі

Сеанс адначасовай ігры.

НІЎКА

Тамаваломка

Раздзяліце фігуру чатырма лініямі на восем частак і з атрыманых частак складзіце квадрат.

*

Адказ на заданне з папярэдняга нумара: 5 і 7.

ПАСЛЯ ЭКЗАМЕНА

Двое вучняў размаўляюць пасля экзамена.

— Ведаеш, я не мог выканаць заданне настаўніцы, — прызнаўся першы, — і таму аддаў ёй толькі чысты сшытак.

— Я зрабіў тое ж самае, — узрадаваўся другі.

— Атрымліваецца не зусім добра: настаўніца ж можа падумаць, што ты... усё запазычыў у мяне.

УСЁ

Маці шчыра гаворыць:

— У мяне тры дачкі. Усіх траіх выхавала, выдала замуж і дапамагла ім развесціся! Большага нельга патрабаваць ні ад якой маці!

ГУМАР З

АДЧУЎ

Быў у аднаго селяніна сын, які часта да чаркі прыкладаўся. Што ўжо бацька не рабіў, каб адвучыць сына ад п'янства, — нічога не памагала. Аднойчы бацька ішоў сялом і ўбачыў п'янага, што ляжаў у лужыне пасярэдзіне вуліцы. Бацька хуценька пабег дамоў за сынам. Вось, думае, убачыць сын п'янага ў гэтакім стане, кіне піць.

Прывёў бацька сына да п'янага і паказвае:

— Бачыш, што зрабіла віно з чалавекам? З ног зваліла!

А сын аж падскочыў:

— Ой, тату, ці ты не ведаеш, дзе тая карчма, у якой такое харошае віно прадаюць?

МІНІБАЙКІ

СМЕХ — СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

У лесе арганізавалі агляд новай кінакамедыі. Першым засмяяўся Крот. На яго шыкнулі:

— Ты што, сляпы, не бачыш, Леў не смяецца!

Другім засмяяўся Глушэц. І на яго шыкнулі:

— Ты што, глухі, не чуеш, Леў не смяецца?

Урэшце засмяяўся сам Леў. І тады Ліса захахатала ва ўсё горла.

— Хораша смяешся, — пахваліў Леў, — маеш пачуццё гумару.

Адсюль мараль: хораша смяецца той, хто смяецца апошнім.

А. Азаў, У. Ціхвінскі

...Перш чым зарэгістраваць шлюб, ад жаніха і нявесты ён патрабаваў пасведчанне аб каханні.

...Ён спускаўся на дно, а запэўніваў: шукаю глыбіню.

С◆К◆А◆Р◆Г◆А

Пазваніў Вепрукоў:

— Калыскін? Прывітанне. Слухай, тут на цябе скарга... Якая? Сур'ёзная вельмі. Грамадзянін Буслаў скардзіцца, што на яго скаргу, якую ён табе даслаў, ты нават не адказаў. Давай, братка, варушыся.

Пазваніў Калыскін:

— Скібін? Гэта я. Тут мне на цябе грамадзянін Буслаў скаргу падкінуў. Скардзіцца, разумееш, што на яго скаргу, якую ён табе даслаў, ты нават не адказаў. Блага, Скібін... Давай, давай...

Пазваніў Скібін.

— Коўзун? Грамадзянін Буслаў скардзіцца, што ты яго скаргу пад сукно сунуў. Непарадак. Разбярыся.

Пазваніў Коўзун:

— Маруся? Якую там скаргу нейкі Буслаў надрапаў? А ты пашукай, пачакаю. Знайшла? Чытай. Так, так, так... А пры чым тут мы? Ну, добра, адкажу яму, што меры прымем. Усё. Алё, таварыш Скібін? Коўзун турбуе. Са скаргай Буслава разабраліся. Справа ў тым, што бюро прагнозаў падвяло. Абяцалі сонечны дзень, а пайшоў дождж, і Буслаў вымак, насмарк падхапіў. А як жа, адказалі. Меры прымем.

Пазваніў Скібін:

— Карп Іванавіч? Скібін турбуе. Са скаргай разабраўся. Коўзун вінаваты. Канешне, канешне. Меры прымем.

Пазваніў Калыскін:

— Прабачце, Сямён Піліпавіч, што адрываю. Са скаргай разабраўся. Скібін, разумееце, падвёў. Будзе выкарана. Меры прымем. Да пабачэння.

Вепрукоў уздыхнуў і ўзяўся за пяро:

«Паважаны т. Буслаў!

Паведамляю, што Ваша скарга грунтоўна разгледжана. Факты пацвердзіліся. Вінаваты пакараны.

З павагай С. П. Вепрукоў».

Уладзімір Багдановіч

ЗАМЕЖНЫ

Гаспадар маленькай гасцініцы запытаў раніцай у чалавека, які здымаў нумар, ці добра яму спалася.

— Я нават не змог заплюшчыць вочы, — абурыўся той. — Мала таго, што на ложку мулка спаць, дык у маім пакоі яшчэ біліся паміж сабою... два пацукі.

— А вы што — хацелі ў такой старызне, як мая гасцініца, і за такія грошы, якія вы заплацілі, бачыць бой быкоў?!

ЛЕПШ АДРАЗУ

— Мне білет на самае апошняе месца, — просіць пасажыр у касіркі.

— Чаму? У нас ёсць яшчэ білеты і на першыя месцы.

— Ат, першае месца давядзецца ўступіць, калі зойдзе ў аўтобус хто старэйшы.

ЧАСОВА

Да дырэктара завода нечакана ўваходзіць жонка і застае ў яго маладзенькую прыгожанькую сакратарку.

— Мілы, ты заўсёды гаварыў, што ў цябе старая сакратарша.

— Так, так, — адказвае разгублены дырэктар, — але яна хворая і замест сябе прыслала ўнучку.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Гені Хаманюк і Тамары Данілюк з Райска Бельскага павету, Ані Каліноўскай з Ляшукоў Гайнаўскага павету і Галіны Анціпюк з Міхалова Беластоцкага павету змяшчаем папулярную ў апошні час

Piosenkę o jednej takiej

Ref.: taka, taka...

Żyła obok nas,
To jest nie do uwierzenia,
Żyła przez cały czas
Jak nikły cień, od niechcenia.
Wszyscy mówili, że
Z dziewczyny tej nic nie będzie.
Kopciuszek, nieśmiały szkrab
Wśród dziewcząt się nie liczył:
Jest lepsza już każda z nas,
Zupełnie pozbawiona wad.
No i co, proszę was,
To jest nie do uwierzenia...
Gdzieś wyjechała raz...
No cóż, nie ma jej, no to nie ma.
Każdy zapomniał, że
Dziewczyna taka tu żyła.
A okazało się,
Że to inaczej z nią było.

Taka, taka, taka, taka, taka,
Taka, taka, taka, taka, taka,
Taka, taka, taka, ta co jej
Nie zauważył nikt;
Taka, taka, taka, taka co
Się chłopcom teraz śni.

Razu pewnego ktoś
Nam porozwieszał afisze,
Że tu przybywa gość
O którym świat cały słyszał.
Wszyscy usiedli i
Dosłownie aż oniemieli,
Bo to Kopciuszek był
Co się w królewnę przemienił.

Refren: Taka, taka...

ЧАГО Ў СПОРЦЕ НЕ БЫВАЕ!

— *З ім немагчыма весці блізкі бой: ён наеўся часнаку.*

ЧАМУ?

— Доктар, вельмі ж баліць левая нага...

— Што зробіш, узрост....

— Але чаму не баліць правая? Хіба яна не такая старая?

КУР'ЁЗЫ

АХ, УЖО ГЭТЫЯ КОНІ...

Нямала кур'ёзаў было на алімпійскіх спаборніцтвах пяціборцаў у 1932 годзе. Адзін з самых масіўных спартсменаў — Швед Свен Тофельт (цяперашні прэзідэнт Міжнароднага саюза сучаснага пяцібор'я і біятлона), які важыў больш за сто кілаграмаў, па жэрабю атрымаў... самага лёгкага каня. Тройчы падаў ён на дыстанцыі, і ўвогуле чэмпіён мінулых тульняў здолеў заняць толькі пятнаццатае месца ў пераадоленні перашкод.

А вось партугальскаму пяціборцу дэ Герэдзія дастаўся выдатны, паслухмяны конь з адзіным, бадай, недахопам: ён вельмі хваравіта рэагаваў на ўдары. І калі барон, што называецца, з месца ў кар'ер пусціў у ход хлыст і шпоры, конь тут жа скінуў яго на зямлю і ўцёк. З цяжкасцю злавілі жывёліну і падвялі да дэ Герэдзія. Раз'юшаны спартсмен зноў пусціў у ход хлыст, і малюнак паўтарыўся з абсалютнай дакладнасцю...

ЦАНА РАЗГУБЛЕНАСЦІ

Аўтамабіль, у якім знаходзіліся чатыры жанчыны, ціха каціўся па развадному мосту цераз заліў Тампа ў Фларыдзе. За рулём аўтамабіля сядзела 72-гадовая Мадлен Доў. Забалакаўшыся з сяброўкамі, старая не пачула папераджальнага званка. Калі ж місіс Доў заўважыла, што мост разводзяць, было позна ўжо — аўтамабіль аказаўся на самай сярэдзіне мосту. Машына з пасажыркамі, зачапіўшыся за край развадной часткі мосту, павіснула над залівам на 10-метровай вышыні.

Гадзіна спатрэбілася прыбыўшым на месца здарэння пажарным, каб з дапамогай крана спачатку вызваліць жанчын, а затым зняць і аўтамабіль.

СМЯЕЦЦА З НАМІ

Са сцэны сыходзяць не толькі артысты...